Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

САКАВІК 30 ПЯТНІЦА 1934 г. № 70 (4903)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ПРЫВІТАННЕ тав. КАЛІНІНУ

У сувязі з 15-годдзем твайго прабывання на пасту старшыні Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саветаў шлем табе гарачае сяброўскае прывітанне і пажаданні далейшай пладатворнай работы на доўгія гады па ўмацаванню совецкай дзяржавы і паспяховаму будаўніцтву соцыялізма.

І. СТАЛІН.
Л. КАГАНОВІЧ.
К. ВАРАШЫЛАЎ.
В. МОЛАТАЎ.
С. ОРДЖАНІКІДЗЕ.
А. АНДРЭЕЎ.
В. КУЙБЫШЭЎ.
С. КІРАЎ.
С. КАСІОР.
А. МІКАЯН.
П. ПОСТЫШЭЎ.
Г. ПЕТРОЎСКІ.
В. ЧУБАР.
Я. РУДЗУТАК.
А. ЖДАНАЎ.
А. ЕНУКІДЗЕ.

СПЛАЎ—БАЯВЫ ЭКЗАМЕН

Рэкі Беларусі ўскрыліся. Прайшоў ледаход. Па водных артэрыях рэспублікі пайшлі параходы, баржы, маторны флот. Навігацыя пачалася.

Але не аб гэтым мы хочам гаварыць зараз. Нас цікавіць, чаму да гэтага часу органы Наркамлеса, мясцовыя партыйныя арганізацыі не падрыхтаваліся да сплаву, не скарысталі поўаводдзя для сплаўных работ. Калі-б рэкі маглі гаварыць, яны-б расказалі рад абураючых спраў, мяжуючых з дзяржаўнымі злачынствамі, якія творацца ў кіруючых арганізацыях, ведаючых сплавам.

Молевы сплаў пачаўся. Самы спрыяючы час для яго зараз. Гаспадарчыя арганізацыі ТОЛЬКІ ЦЯПЕР канчаюць падрыхтоўчыя работы.

Прамаргалі зімні сезон. Пгэн зімовай сплоткі выканан на 86,3 проц. А калі ўзяць квартальны план вывазкі дзелавой драўніны, то на 20 сакавіка ён выканан на 80,5 проц., а па дровах — на 75 проц.

Вось ганебныя паказальнікі, з якімі сустрэлі сплаўную кампанію ў Беларусі.

Пакуль чыноўнікі з апарата Наркамлеса і мясцовых гаспадарчых арганізацый скрыпелі пер'ямі ў сваіх канцылярыях, вясна прышла і застала іх знянацку, непадрыхтаванымі.

І на самой справе, з 23.614 чал. рабочых, патрэбных для сплаўных работ, завербавана толькі 9.812 чал. Ганебна правальваецца заключэнне дагавораў з калгасамі на рабочую сілу. У Наркамлесе бездапаможна разводзяць рукамі, а сплаву, як гавораць, ад гэтага не пягчэй.

Гаспадарнікі да гэтага часу не могуць зразумець асноўнай ісціны, што мала завербаваць рабочых (чаго яны не зрабілі), трэба-ж стварыць ім неабходныя ўмовы для работы. А аб гэтым не думаюць.

У аддзеле рабочага снабжэння Лесбела на пытанне, колькі адкрыта сталовых, чайных і т. д. — нам адказалі:

— 10 красавіка атрымаем справаздачу па форме № 7 і тады будзем ведаць.

Адказ, варты гогалеўскага Акакія Акакіевіча. Такое-ж, калі не горшае, становішча і з забеспячэннем рабочых жыллём. За формай людзі не бачаць жывога чалавека, не цікавяцца ім. І не дзіўна, што вярбоўка рабочай сілы правальваецца.

Такавы паказальнікі падрыхтоўкі к сплаўнай кампаніі. Мы ўжо не гаворым аб тым, што маторны флот непадрыхтаваны. Не гаворым таксама і аб такелажы, якім не забяспечаны сплаўныя ўчасткі.

У чым-жа прычына такога агіднага становішча? Асноўная прычына заключаецца ў нікуды нягоднай рабоце апарата Наркамлеса, у спабым, недапушчальным кіраўніцтве гэтай справай мясцовых раённых партыйных арганізацый. Апарат Наркамлеса працуе па-старынцы. Тут рашэнні XVII з'езда аб ліквідацыі функцыяналкі паклалі пад сукно. Аддзелы, пададдзелы, функцыянеры ўсё яшчэ працуюць так, як яны працавалі ў мінулым годзе, як быццам нічога не змянілася. Гэта-ж факт, што апрача асноўнага сектара (сектар сплава, начальнік КАЗІМІРАЎ) сплавам займаюцца некалькі сектароў. Так: тэхнічным снабжэннем сплаўных работ ведае сектар снабжэння, кадрамі — аддзел кадраў, снабжэннем сплаўшчыкаў — аддзел рабочага снабжэння і т. д. Карацей кажучы, як быццам займаюцца сплавам усе, а плян правальваецца. Пры такой структуры апарата немагчыма наладзіць кантроль, немагчыма падняць адказнасць, бо адна і тая-ж работа распылена, раскідана і цяжка знайсці вінаватых.

Атмасфера безадказнасці і беспакаранасці на вытворчасці, на лесапунктах, у леспрамгасах, у сплаўных канторах — вось корань зла.

Наркамлес СССР тав. ЛОБАЎ у сваім загаворе палкоэсліў асабліва недапушчальную адстапасць у падрыхтоўцы да сплаву трэста Лесбел. Гэты загад — суровае папярэджанне для ўсіх лясных арганізацый. Загад дае чоткую дырэктыву, як трэба працаваць для таго, каб забяспечыць поспех кампаніі. Давесці гэты загад да мас, зрабіць яго штодзённай праграмай работы — вось у чым задача.

Раённыя партыйныя арганізацыі павінны напружыць усе сілы для поўнага выканання плана молевага сплава. Гэта ў сваю чаргу звязана з узмацненнем падвозкі лесаматэрыялаў к сплаўным участкам. Недапушчальнаму адставанню трэба пакласці канец. Партарганізацыі павінны зразумець, што ад правільнага снабжэння лесаматэрыяламі залежыць поспех выканання планаў прамысловасці і будаўніцтва. І ў гэтай справе аграмадную ролю адыгрывае сплаў.

Наркамлес і яго мясцовыя арганізацыі павінны неадкладна прыняць усе меры к снабжэнню ўчасткаў такелажам і буксірным флотам. Трэба зараз-жа закончыць рамонт маторнага флота. Перакінуць са складаў і баз на ўчасткі ўсе неабходныя матэрыялы. Трэба-ж зразумець, што ад гэтага залежыць поспех сплава.

Адным з рашаючых пытанняў павінна стаць поўнае забеспячэнне сплаўных работ рабочай сілай. Тут райкомы партыі і нізавыя партэвені павінны аказаць органам Наркамлеса ўсямерную дапамогу. А трэба прама сказаць, што аробы партарганізацыі і нават райкомы партыі замест дапамогі тармозяць заключэнне дагавораў. Закон урада аб адыходніцтве цялкам захоўвае сваю сілу. Закон яго партарганізацыі павінны разгарнуць шырокую масавую работу з тым, каб забяспечыць сплаўныя работы рабочай сілай.

Апарат Наркамлеса і профсаюзныя арганізацыі павінны стварыць такія ўмовы аплаты працы і снабжэння сплаўшчыкаў, пры якіх лепшы ўдарнік быў-бы цалкам зацікаўлен у сваёй рабоце.

Пара пакончыць з папяровай перапіскай. Поспех выканання плана вырашаецца на сплаўным участку, у леспрамгасе, у калгасе. Трэба зараз з апаратаў кінуць максімум сіл у нізы для дапамогі ў гэтай рабоце.

Газета «Лесная промышленость» абвясціла двухдэкаднік агляду падрыхтоўкі да сплава. БССР павінна ўключыцца ў гэта мерапрыемства. Мы павінны ператварыць гэты двух дэкаднік у магутную кампанію па завяршэнню падрыхтоўкі і шырокаму разгортванню навігацыі. Камуністы і комсамольцы абавязаны ўзначаліць гэту кампанію.

Наступілі рашаючыя дні. І ад таго, наколькі мясцовыя партыйныя, профсаюзныя і комсамольскія арганізацыі і органы Наркамлеса перабудуюць сваю работу, залежыць поспех сплава.

Сплаў для органаў Наркамлеса і для іншых гаспадарчых, партыйных, профсаюзных арганізацый з'яўляецца баявым экзаменам на ўменне па-большэвіцку ажыццяўляць рашэнні XVII з'езда. І гэты экзамен трэба здаць на «выдатна».

ЗАБЯСПЕЧЫМ ПЕРАМОГУ

— Навучаныя леташнім вопытам, мы сёлета арганізавалі справу інакш. Мы дабіліся поўнай гаспадарчай самастойнасці. Я сёння ўпэўнен у сіле сваёй брыгады, ведаю кожнага свайго работніка і работніцу. Я ўступаю ў пасеўную з упэўненасцю ў перамозе, — так заяўляе ў сваім выступленні брыгадзір другой паляводчай брыгады калгаса «Гпуша», Бабруйскага раёна Лось Андрэй.

— Падрыхтоўка да сяўбы ў гэтым годзе адрозніваецца ад леташняй як неба ад зямлі. Да сяўбы поўнасцю гатовы, правядзем яе добра ў вызначаныя тэрміны, — піша ў сваім пісьме брыгадзір калгаса «Май», Крупскага раёна Пацееў.

Упэўненымі ў перамозе выходзяць на соцыялістычныя палі ў гэтым годзе сотні, тысячы перадавых калгасных брыгад на чале з брыгадзірамі, лепшымі майстрамі калгаснай зямлі.

Няўмерна вырасла актыўнасць калгасных мас, расце і шырыцца спаборніцтва за чэсную калгасную працу, за беражлівыя адносіны да калгаснага дабра, за заможнае культурнае калгаснае жыццё.

Але няўмерна ўзраслі і патрабаванні, якія пастаўлены перад намі XVII партыйным з'ездам. Веснавая пасеўная кампанія гэтага года пачынаецца з'ніцца начаткам таго быстрага ўздыму і магутнага разбегу сельскай гаспадаркі, які высунуў перад усёй краінай тав. СТАЛІН.

На ініцыятыве брыгадзіраў Мінасць-Куранінскай МТС, шырока разгарнулася спаборніцтва калгасных брыгад БССР на лепшае правядзенне веснавой сяўбы. Уздым спаборніцтва на вёсны ўскладае вялікія абавязкі на ўсе партыйныя арганізацыі, на партыйнае і совецкае кіраўніцтва раёнаў. Яны ў першую чаргу адказваюць за тое, каб узняты рух мас пайшоў па правільнаму руслу, даў максімальны рэзультат у справе моткай арганізацыі калгаснай працы, у правільнай расстаноўцы сіл на палях пасеўнай і ў барацьбе за якасць работ.

Не павінна быць спаборніцтва нагул. Нішто так не патрабуе канкрэтнага апаратыўнага кіраўніцтва, практычнасці і дзелавітасці, як соцыялістычнае спаборніцтва. Інакш спаборніцтва можа ператварыцца ў пустую балбатню, найлепшыя пачынанні і імкненні могуць прайсці бясследна.

Выступіўшыя на старонках «Звязды» брыгадзіры калгаса імя Фалько, Менскага раёна, узялі на сябе рад абавязацельстваў па лепшаму правядзенню сяўбы і выклікалі на спаборніцтва калгасныя брыгады Менскага раёна. Аднак, адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва спаборніцтвам з боку Менскай МТС ператварыла дагавор аб спаборніцтве, падпісаны брыгадамі калгаса імя Фалько, у пустую паперку. Абавязацельствы па ліквідацыі абязлічкі па канюшнях не выкананы. У выніку — коні да сяўбы не падрыхтаваны, не гатоў інвентар. Асноўная ўмова перамогі — правільная арганізацыя працы ў калгасе — адсутнічае. Няма сапраўднай барацьбы за дысцыпліну.

Каму-ж патрэбна такое спаборніцтва? Няхай лепш спаборнічаюць дзве брыгады, але па-сапраўднаму, абменьваючыся вопытам, падштурхоўваючы адстаючых, чым 10 брыгад без дзелавой праверкі, адныні рэзалюцыямі.

Праз некалькі дзён у Менску адкрываецца ўсебеларуская вытворчая нарада лепшых калгасных брыгадзіраў БССР. Задача нарады — падвесці папярэднія вынікі разгарнуўшагася спаборніцтва, абмяняцца вопытам лепшай арганізацыі працы і расстаноўкі сіл у калгасная брыгадзе, зрабіць гэты вопыт перадавікоў здабыткам усіх калгасных брыгад БССР.

Скарыстоўваючы вопыт лепшых, дапамагаючы адстаючым, даб'ёмся паспяховага правядзення сяўбы, высокага ўраджаю соцыялістычных палёў.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

па тэлеграме сакратара ЦК ВКП(б) тав. ЖДАНАВА аб падрыхтоўцы да сяўбы аднаасобнікаў у Гомельскім і Магілеўскім раёнах, а таксама па паведамленнях сакратароў Рагачоўскага і Жлобінскага РК КП(б)Б па пытанню аб аднаасобніку

Заслухаўшы паведамленні сакратароў: Гомельскага ГК КП(б)Б т. Шафарэнка, Магілеўскага РК КП(б)Б т. Рэвінскага і спецыяльна пасланых ЦК КП(б)Б для праверкі становішча на месцы членаў ЦК тт. Горына і Брагінскага, бюро ЦК КП(б)Б лічыць, што факты выключна слабай работы сярод аднаасобнікаў у паказаных раёнах — поўнасцю пацвярджаюцца.

У дрыватнасці, па Гомельскаму раёну стан падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы характарызуецца наступнымі данымі:

а) давядзенне плана да аднаасобных гаспадарак на 10 сакавіка складае 50 проц.;

б) амаль зусім не арганізавана ачыстка насення аднаасобнікаў і праверка іх усхожасці;

в) рамонт сельскагаспадарчага інвентара на 10 сакавіка складае 45 проц.;

г) слабая вывазка гною на палі (285 вазоў).

Апрача гэтых паказальнікаў, устаноўлена, што сярод аднаасобнікаў да сучаснага моманту слаба праводзілася масавая, палітычная і арганізацыйная работа (сходы аднаасобнікаў, з пастаноўкай на іх пытанняў падрыхтоўкі да сяўбы; работа з упаўнаважанымі па дзесяцідворках і т. д.). Факты-ж значнага разбазарвання каня аднаасобнікамі па Гомельскаму раёну лішні раз пацвярджаюць слабасць работы сярод аднаасобнікаў.

ЦК лічыць, устаноўленым, што па Магілеўскаму раёну становішча з падрыхтоўкай аднаасобніка да сяўбы і ў цэлым работа з ім яшчэ больш ярка падкрэсліваюць поўную няўвагу да работы сярод аднаасобнікаў у раёне, што пацвярджаецца наступным: план давядзен да аднаасобных гаспадарак на 10 сакавіка толькі на 39,2 проц.; ачыстка насення аднаасобнікаў і праверка іх усхожасці не арганізавана; сельскагаспадарчы інвентар адрамантован на 36,3; вывезена гною толькі 7,8 проц.

Па заяве сакратара Магілеўска га РК КП(б)Б т. Рэвінскага, у Магілеўскім раёне ёсць масавае разбазаравание аднаасобнікамі каня, даходзячае ў некаторых сельсоветах да 50 проц.

Пасля запытання ЦК ВКП(б) і ў асаблівасці пасля тэлеграмы сакратара ЦК ВКП(б) т. Жданава і па сылцы ЦК КП(б)Б у сувязі з гэтай тэлеграмай работнікаў у Гомельскі і Магілеўскі раёны, — па Гомельскаму раёну праведзена значная работа з аднаасобнікам, ва ўсе сельсоветы разасланы кіруючыя работнікі гарадскога актыва для непасрэднай дапамогі месцам у рабоце сярод аднаасобнікаў, у рэзультаце чаго разгорнута шырокая масавая і арганізацыйная работа.

Паказальнікі работы з аднаасобнікам значна палепшыліся: на 20 сакавіка пасеўпланы па аднаасобных гаспадарак даведзены на 90,6 проц., ачышчана насення на 80 проц., вывезена гною — 5.843 вазы.

Па Магілеўскаму-ж раёну к моманту даклада па Бюро ЦК — па даных праверкі, праведзенай тав. Брагінскім сумесна з Магілеўскім РК — становішча амаль без змены, чым да сённяшняга дня не ліквідавана небяспека зрыву выканання пасеўных планаў з боку аднаасобнікаў гэтага раёна.

2. Бюро ЦК лічыць, што такое становішча падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы стварылася ў рэзультаце недаацэнкі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі ўказаных раёнаў значэння работы сярод аднаасобнікаў, у асаблівасці па падрыхтоўцы іх да сяўбы. І гэта не гледзячы на тое, што ўдзельная вага аднаасобнага сектара ў гэтых раёнах займае значнае месца ў пасеўным плане.

Выходзячы з гэтага, Бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

І. ПА МАГІЛЕЎСКАМУ РАЁНУ

1. Сакратару РК тав. Рэвінскаму і старшыні РВК т. Пупчыну абвясціць вымову, прапанаваўшы ім пад іх персанальную адказнасць неадкладна перабудаваць работу партыйных і совецкіх арганізацый раёна, з тым, каб у бліжэйшыя-ж дні быў дасягнут рашучы пералом у справе падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы.

2. РК і РВК абавязаны дабіцца ліквідацыі недаацэнкі з боку партыйнай і совецкай арганізацыі раёна — работы сярод аднаасобнікаў, рашуча прыцягваючы да адказнасці тых з работнікаў і арганізацый, якія гэту работу не праводзяць.

3. Замест агульных разважанняў аб недахваце насення ў аднаасобніка — неадкладна разгарнуць масавую растлумачальную і арганізацыйную работу партыйных і совецкіх арганізацый раёна, з тым, каб шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў раёна, аднаасобнай гаспадаркі дабіцца поўнага забеспячэння насеннем усёй на сеўнай плошчы аднаасобнага сектара раёна.

4. Неадкладна разгарнуць шырокую работу, забяспечваючую (згодна ўказанняў ЦК па Касцюковіцкаму і Дубровенскаму раёнах) спыненне разбазаравання каня, убою жывёлы ў раёне як кал гаснікамі, так і аднаасобнікамі, прыцягваючы да найстражэйшай судовай адказнасці кулацкія, антысовецкія, спекулятыўныя элементы, якія вядуць падрыўную работу і арганізоўваюць знішчэнне жывёлы.

5. Прапанаваць РК, РВК арганізаваць праверку наяўнасці і якасці насення ў аднаасобнікаў у адпаведнасці з указаннямі ЦК, аказваючы канкрэтную дапамогу як зернаачышчальнымі машынамі, пратручвальным матэрыялам, арганізацыяй праверкі ўсхожасці, так і ў асобных выпадках і насеннем за кошт раённых рэсурсаў.

6. Адзначаючы наяўнасць раду фактаў несвоечасовага выдзялення зямлі асобнымі аднаасобнымі гаспадаркамі пад яравую сяўбу, даручыць РК і РВК неадкладна арганізаваць выдзяленне гэтай зямлі.

II. ПА ГОМЕЛЬСКАМУ РАЁНУ

1. Адзначаючы, што партыйнае і совецкае кіраўніцтва Гомельскага раёна пасля запытання ЦК і ў асаблівасці пасылкі ў Гомельскі раён прадстаўніка ЦК т. Горына — прарабіла значную работу па выпраўленню становішча спраў з аднаасобнікам, — абмежавацца ўказаннем кіраўніцтву раёна — сакратару Гомельскага ГК КП(б)Б т. Шафарэнка і старшыні горсавета т. Карнаўову, прапанаваўшы ГК і горсавету ні ў малейшай ступені не аслабляць разгорнутую работу па падрыхтоўцы аднаасобнікаў да сяўбы, маючы на ўвазе, што пры наяўнасці вялікага партыйнага актыва і невялікай сельскагаспадарчай перыферыі Гомельскага раёна паўтарэнне падобных памылак у будучым зусім недапушчальна.

2. Указанні, даныя Бюро ЦК у адносінах Магілеўскага раёна, павінны быць улічаны і ў рабоце Гомельскай арганізацыі.

III.

1. Заслухаўшы дадаткова паведамленні сакратароў: Рагачоўскага РК т. Геўрасева і Жлобінскага РК т. Плешакова, Бюро ЦК падкрэслівае, што становішча з падрыхтоўкай аднаасобніка да сяўбы і па гэтых раёнах з усёй сур'ёзнасцю ўказвае на слабую работу сярод аднаасобнікаў.

2. Па Рагачоўскаму раёну, не гледзячы на праробленую значную работу па калгаснаму будаўніцтву, што выразілася ў заметным росце калектывізацыі па раёну, у асаблівасці ў зоне дзейнасці МТС (з 20 да 41 проц.), работа сярод аднаасобнікаў таксама пастаўлена слаба. Гэта пацвярджае тое, што па страхавых фондах засыпана 37 процентаў; не праведзена сур'ёзная работа сярод аднаасобнікаў па забеспячэнню насеннем. Адзначаюцца факты разбазаравання аднаасобнікамі жывёлы. Асабліва дрэнна стаіць справа з давядзеннем пасеўных плошчаў да аднаасобных гаспадарак — з 26 сельсоветаў планы пасеву даведзены да аднаасобнай гаспадаркі толькі па 12 сельсоветах.

3. Не гледзячы на прамое ўказанне і зусім чоткія дырэктывы, даныя ЦК КП(б)Б па пытанню аб праверцы наяўнасці і становішча насення ў аднаасобнікаў, Жлобінскім РК КП(б)Б да выкліку ў ЦК амаль нічога не зроблена ў ажыццяўленне даных дырэктыў.

Па даных на 20 сакавіка пасеўныя планы да аднаасобных гаспадарак даведзены толькі да 62,5 проц. гаспадарак. Масавае разбазаравание каня ў Жлобінскім раёне гаворыць не толькі аб адсутнасці работы сярод аднаасобнікаў па гэтаму пытанню, але з'яўляецца таксама рэзультатам недастатковай барацьбы з кулацка-варожымі элементамі.

4. Указаць сакратарам — Рагачоўскага РК КП(б)Б Геўрасеву і Жлобінскага РК Плешакову на слабую работу сярод аднаасобнікаў у цэлым па раёну.

Папярэдзіць сакратара Рагачоўскага РК КП(б)Б Геўрасева, старшыню РВК тав. Зеленка, сакратара Жлобінскага РК КП(б)Б Плешакова, старшыню РВК Адамчука, што яны абавязаны зрабіць усе вывады з пастановы ЦК, дабіўшыся неадкладнага пералому ў рабоце сярод аднаасобнікаў, улічыўшы ўсе практычныя ўказанні, даныя Бюро.

5. Становішча падрыхтоўкі аднаасобнікаў да сяўбы і становішча ў цэлым работы па аднаасобнаму сектару па ўказаных у данай пастанове раёнах — цалкам і поўнасцю пацвярджаюць неабходнасць узмацнення работы партыйных і совецкіх арганізацый з аднаасобнікамі па ўсіх раёнах БССР. У сувязі з гэтым Бюро ЦК прапануе ўсім РК, РВК і палітаддзелам, улічыўшы недахопы ў рабоце ўказаных раёнаў, неадкладна выправіць наяўныя падобнага роду памылкі ў сваіх раёнах, дабіўшыся ў бліжэйшыя-ж дні поўнай падрыхтоўкі аднаасобніка да сяўбы (забеспячэнне насеннем, ачыстка, пратручванне насення, давядзенне планаў да кожнага аднаасобнага двара, падрыхтоўка каня, рамонт сельгасінвентара, вывазка гною і т. д.).

Уся гэта работа па падрыхтоўцы аднаасобнікаў да сяўбы павінна праходзіць на аснове спалучэння самага шырокага разгортвання агітацыйна-масавай растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў з рашучай барацьбой супроць кулацкіх антысовецкіх элементаў, прабуючых сарваць падрыхтоўку аднаасобнікаў да сяўбы.

6. Аб недапушчальна слабай рабоце сярод аднаасобнікаў, а мясцамі і ігнараванні гэтай работы сведчыць наяўнасць недапушчальных фактаў затрымання разгляду заяў аднаасобнікаў аб уступленні ў калгас. Бюро ЦК лічыць, што падобнага роду адносіны да афармлення ўступлення ў калгас аднаасобнікаў і афармленне новых калгасаў мяжуюць з прамым супраціўленнем справе далейшай калектывізацыі. ЦК прапануе РК і палітаддзелам неадкладна расследаваць усе факты затрымання разгляду заяў аднаасобнікаў аб уступленні ў калгас і афармленні новаарганізуемых калгасаў, прыцягваючы вінаватых у кожным асобным выпадку да суровай адказнасці.

Прапанаваць РК і палітаддзелам забяспечыць сур'ёзную масавую растлумачальную і арганізацыйную работу сярод уступаючых у калгас аднаасобнікаў, і ў асаблівасці забеспячэнне дапамогі і садзейнасці новаарганізуемым калгасам (падбор кадраў, арганізацыя працы, масавая работа і т. д.).

ЦК папярэджвае супроць усякіх спроб адміністравання ў справе калектывізацыі, пагоні за процантамі і агульнага прыёму аднаасобнікаў у калгасы і прапануе пры прыёме ў калгас праводзіць індывідуальную праверку кожнага ўступаючага як ва ўжо існуючыя, так і ў новаарганізуемыя калгасы.

ПЯТНАЦЦАЦЬ ГОД НА ПАСТУ УСЕСАЮЗНАГА СТАРАСТЫ

Палкае большэвіцкае прывітанне Міхаілу Ізанавічу КАЛІНІНУ

ДАРАГІ МІХАІЛ ІВАНАВІЧ!

У дзень твайго 15-годдзя на пасту старшыні ЦВК прэзідыума ЦВК Саюза ССР і прэзідыум ВЦВК шлюць табе гарачае прывітанне.

Выражаем табе шчырыя пажаданні яшчэ доўгія гады захаваць сваю бадзёрасць і энергію і па-ранейшаму кіраваць намі. Твае кіраўніцтва для нас асабліва каштоўна тым, што ты, маючы багаты жыццёвы вопыт і рэволюцыйную загартаванасць, няўхільна перавараеш у жыццё рашэнні партыі і з'яўляешся верным саратнікам правадыра яе т. Сталіна.

ПРЭЗІДЫУМ ЦВК САЮЗА ССР.
ПРЭЗІДЫУМ ВЦВК

М. І. КАЛІНІНУ

ДАРАГІ МІХАІЛ ІВАНАВІЧ!

У дзень 15-гадовага юбілея Вашага праобывання на адказнейшым пасту старшыні Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта, прэзідыум ЦВК БССР шле Вам — аднаму з самых стойкіх і непахісных барацьбітоў за генеральную лінію партыі, аднаму з самых блізкіх саратнікаў В. І. Леніна і І. В. Сталіна—палкае прывітанне.

Поспехі РСФСР і ўсяго Совецкага Саюза ў справе пабудовы соцыялізма, узмацнення дыктатуры пролетарыята і ўсілення магутнасці совецкай дзяржавы цесна і неразрыўна пераплятаюцца з Вашым, блізкім і дарагім усім сэрцам працоўных, імем, з Вашым мудрым кіраўніцтвам совецкім будаўніцтвам.

Адзначаючы Вашы, Міхаіл Іванавіч, вялікія заслугі перад краінай Советаў, прэзідыум ЦВК БССР жадае Вам яшчэ многіх і многіх гадоў пладатворнай работы на карысць пролетарыята і ўсіх працоўных.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

29 сакавіка 1934.

НА ДАПАМОГУ ЧЭЛЮСКІНЦАМ

КУРС НА ВАНКАРЭМ

ХАБАРАЎСК, 28 (БЕЛТА). Тры самалёты атрада тав. КАМАНІНА ў 6 гадзін 3 мін. па маскоўскаму часу вылецелі з Анадыра ў Ванкарэм. Надвор'е спрыяе палёту.

Галышаў, Даронін і Вадап'янаў вылятаюць у Анадыр

ХАБАРАЎСК, 29. (БЕЛТА).

Сёння ў 6 гадзін 52 мін. па маскоўскаму часу пілоты Галышаў, Даронін і Вадап'янаў вылецелі з Гіжыгі на поўнач. Удзень самалёты спусціліся ў культбазе Каменскае. 30 сакавіка лётчыкі маркуюць вылецець у Анадыр.

***

МАСКВА, 29. (БЕЛТА).

Спецкор «Правды» паведамляе з Хабараўска, што перарваная з-за пургі сувязь з выратавальнымі экспедыцыямі адноўлена. Паводле апошніх паведамленняў, параходы і самалёты скарыстоўваюць кожную гадзіну для прасоўвання ўперад. У прыватнасці пароход «Совет» прадаўжае шлях на поўнач. Пароход «Смоленск», які стаіць у Олюторску, чакае лепшага надвор'я.

„КРАСИН" У ПАХОДЗЕ

БОРТ «КРАСИНА», 28. У Нямецкім моры надзвычай спакойнае с[illegible] нечнае надвор'е. Поўным ходам [illegible] кіроўваемся к берагам Галандыі.

Сёння ў 9 гадзін раніцы прайш[illegible] першую тысячу міль. Механізм[illegible] працуюць надзвычай добра. «Кр[illegible]сін» робіць 12 вузлоў. У 16 гад[illegible] прыбываем у галандскі порт Ху[illegible] Офколен, які знаходзіцца ў некал[illegible]кіх мілях ад Ротэрдама. Зараз-[illegible] станем пад пагрузку вугалю.

Верны сваёй нязменнай мэце [illegible] як мага хутчэй прывесці ледакол [illegible] ільдам лагера Шмідта — нач. эк[illegible]педыцыі т. СМІРНОЎ намеран [illegible] працяту 8 гадзін правесці бункер[illegible]ку і неадкладна прадаўжаць рэ[illegible] праз Ламанш і Атлантычны акія[illegible]

Тав. Смірноў рашыў ісці да П[illegible]намы не спыняючыся, мінуючы Азорскія астравы. Паводле мерк[illegible]ванняў камандавання шлях пр[illegible] акіян займе 20 сутак. Тав. Смірн[illegible] заявіў, што красінцы робяць ўс[illegible] каб скараціць гэты тэрмін.

Паводле прадказанняў метэаралаг[illegible]таў, у Атлянтыцы стаіць рэдк[illegible] спрыяючае надвор'е. Вось чаму м[illegible] імкнемся хутчэй папасці ў акіян.

ЧЭЛЮСКІНЦАМ

МАСКВА, 29 (БЕЛТА).

У «Правде» апублікавана пр[illegible] вітанне пленума ЦС Асоавіяхіма [illegible] люскінцам, у якім гаворыцца:

«13 млн. асоавіяхімаўцаў з з[illegible] хапленнем і гордасцю сочаць за [illegible] раічнай барацьбой слаўных чэлю[illegible]кінцаў—заваёўцаў Арктыкі. Цвё[illegible] да ўпэўнены, што мерамі, прын[illegible] тымі нашым урадам, вы будзе[illegible] знятыя з ільдоў Чукоцкага мор[illegible] Большэвікі заваююць Арктыку».

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

Урад СССР прапанаваў урадам Эстоніі, Латвіі і Літвы прадоўжыць на 10 год тэрмін заключаных гэтымі [illegible] жавамі пактаў аб ненападзе і мірным разборы канфліктаў. Ад названых урадаў атрыманы станоўчыя адказы. Афармленне адпаведных [illegible] таў адбудзецца у бліжэйшым будучым.

МАГУТНЫ ВАГАР БОЛЬШЭВІЦКАГА ПРАВЯДЗЕННЯ СЯЎБЫ ІГНАРУЕЦЦА

БЕЗАДКЛАДНА ЗАКОНЧЫЦЬ ПАДПІСАННЕ ДАГАВАРОЎ МТС З КАЛГАСАМІ

30 САКАВІКА

У пераважнай большасці раёнаў БССР ганебна зрываецца заключэнне дагавароў МТС з калгасамі. Гэтае важнейшае мерапрыемства па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў радам МТС ігнаруецца, імат дзе да яго ажыццяўлення нават і не прыступілі.

Дагавор, які вызначае ўзаемаадносіны паміж МТС з калгасамі ў іх вытворчай дзейнасці, з'яўляецца магутным вагаром у барацьбе за добую падрыхтоўку і правядзенне сяўбы, у барацьбе за заможнае культурнае жыццё. Дагавор, які ўскладае абавязкі на МТС і на калгасы, павінен з'явіцца магутнай сілай для ыкарчоўвання дробна-буржуазнай дзбішчанасці, разгільдзяйства і распбанасці, павінен з'явіцца асноўай сілай для ўмацавання вытворчай дысцыпліны ў калгасных і трактарных брыгадах.

Ці зразумелі гэта кіраўнікі МСЦІЛАЎСКАЙ, ДЗЯРЖЫНСКАЙ і ВЕТРЫНСКАЙ МТС?

У Мсціслаўскай МТС да заключэння дагавароў з калгасамі нават пачэ і не прыступалі. Дырэктар дзяржынскай МТС тав. АТАХЕЛЬ ічыць ніжэй сваёй годнасці займацца гэтай справай. Заключэнне дагавароў ён перадаверыў свайму наспеніку, які выклікае ў габінет да ебе па некалькі старшынь калгасаў прапануе ім падпісаць дагавары.

Самацёкам ідзе падпісанне дагавароў у Ветрынскай МТС. Старшыні калгасаў «Дварэц», «Ульянаўка», выпіканыя ў канцылярыю МТС, падпісалі дагавары, нават не паставіўшы іх на абгаварэнне праўленняў, не паведаміўшы аб гэтым калгаснікаў.

У выніку такога бюракратычна-анцылярскага падыходу да выканання адказнейшага задання партыі ўрада ў калгасах, абслугоўваемых МТС, зрываецца складанне вытворча-гаспадарчых планаў, якія павінны быць па ўсёй БССР складзены ад 1-га красавіка.

Райкомы, райвыканкомы, райземаддзелы, МТС раду раёнаў праяўляюць апартуністычную недавацэнку гэтай справы. Трэба дабіцца таго, каб безадкладна ва ўсіх МТС і калгасах ударна, па-большэвіцку завяршыць заключэнне дагавароў, мабілізаваўшы на іх выкананне ўсіх калгаснікаў, усіх рабочых МТС.

Дзе будуць працаваць трактары?

ТАЛАЧЫН. Талачынская МТС усім не гатова да сяўбы. З 42 трактароў 12 яшчэ не адрамантаваны. Не праверана якасць рамонта. Дырэкцыя дагэтуль не ведае на якіх участках будуць працаваць трактары 12 трактарыстаў яшчэ не атрымалі поўнасцю зарплаты за мінулы год. Дырэктар Баеў толькі разводзіць рукамі: «Я новы чалавек — нічога не ведаю». (БЕЛТА).

ВЕТРЫНСКАЯ МТС ЗРЫВАЕ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ

ПОЛАЦК. (Па тэлеграфу).

Ветрынская МТС правальвае падрыхтоўку да веснавой сяўбы. З 40 трактароў адрамантаваны толькі 15. Зусім не адрамантаваны ўвесь прычэпны інвентар. Калгасы зоны МТС яшчэ не маюць канчатковага плана сяўбы. Няма таксама вытворчых планаў. Дагэтуль МТС не заключаны дагавары з калгасамі на правядзенне работ. Галоўная прычына зрыву падрыхтоўкі да сяўбы — бюракратычна-фармальныя адносіны Наркамзема. МТС зусім не мае апарата: няма дырэктара, няма старшага агранома, няма галоўбуха, ні аднаго агранома на ўчастках. Наркамзем у пачатку лютага прыслаў загад аб назначэнні старшага агранома. Загад ёсць, але агранома няма. Асабліва ганебна зрываецца па МТС заключэнне дагавароў з калгасамі. Дырэкцыя МТС абмежавалася прачытаннем прыкладнага дагавора на нарадзе старшынь калгасаў і больш нічога не зрабіла. Загадчыкі вытворчымі ўчасткамі гэтым пытаннем не займаліся. Загадчык Шпакоўчынскага ўчастка **Баброўскі** больш сядзіць у МТС, чым бывае на ўчастку. Ён не заключыў ні аднаго дагавора. Адноўлькава «працуюць» загадчыкі Ветрынскага і Руднянскага ўчасткаў **Калоднер** і **Савельеў.**

Да 28 сакавіка з 83 калгасаў дагавары заключылі толькі 15. Але і гэтыя дагавары заключаны фармальна, габінетным парадкам. Старшыня калгаса «Барэц» **Васко віч** заключыў дагавор, не абгаварыўшы яго на пасяджэнні праўлення. У калгасе «Ульянаўка» калгаснікі нават не ведаюць пра заключаны дагавор. Становішча з падрыхтоўкай МТС да сяўбы пагражаючае.

НЕЙДЛІН.

МТС НЕ ЗАКЛЮЧАЕ ДАГАВАРОЎ З КАЛГАСАМІ

ДЗЯРЖЫНСК. Дзяржынская МТС злачынна зацягвае заключэнне дагавароў з калгасамі на правядзенне розных работ. Дагэтуль заключаны дагавары з калгасамі толькі аднаго **Ляхавіцкага** сельсавета. Прычым робіцца гэта габінетным парадкам. Намеснік дырэктара МТС **Блінц** збірае адразу некалькі праўленняў калгасаў, абгаворвае з імі дагавары і тут-жа падпісвае. Калгасныя масы аб гэтым нічога не ведаюць.

Складанне вытворчых планаў у калгасах таксама сарвана. Планы складзены толькі па 8 калгасах. МТС гэтай справай вусім не кіруе. Гэта скарыстоўваюць класавыя ворагі для зрыву барацьбы за навышэнне ўраджайнасці. Так, у калгасе «Чырвоны маяк» вызначылі ўраджай зернавых у размеры 7 цэнтнераў з га.

Райком партыі і райвыканком зусім не цікавяцца заключэннем дагавароў з калгасамі і складаннем вытворчых планаў.

НАПЯРЭДАДНІ МАСАВАЙ СЯЎБЫ

(Па матэрыялах Белта і нашых карэспандэнтаў)

Калгас «Пролетарская перамога», Карсакоўскага сельсовета, **Барысаўскага** раёна, вышаў у поле. За першы дзень узарана 3 гектары цалины, расцэраблены 2 гектары севажанні і 0,5 гектара пахані.

Калгас імя Фабрыцыуса **Менскага** вагонна-рамонтнага завода імя Мяснікова закончыў ворыва. Калгас забяспечан праверанымі і пратручаным добраякасным насеннем. 30 сакавіка калгас пачынае сяўбу аўса і ячменю.

Уздзенская МТС яшчэ не скончыла рамонта трактароў. 10 трактароў не маюць раборд, 6 трактароў не маюць шпор, 3 трактары не маюць вадзяных карбюратараў. Рамонт двух трактароў яшчэ не пачыналі. Якасць адрамантаваных трактароў не праверана. Не лепшае становішча з заключэннем дагавароў МТС з калгасамі. Да гэтага часу не заключаны дагавары з 31 калгасам.

На працягу двух тыдняў на станцыі **Негарэлае** па віне начальніка станцыі ляжыць і чакае адгрузкі 90 тон насеннай бульбы, якая загатоўлена ўздзенскім райспажыўсаюзам.

КАЛІ-Ж НКЗ АДГУКНЕЦЦА НА ВЫКЛІК ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ?

Рэдакцыі газеты „Звязда" (гор. Менск), „Рабочий путь" (Смаленск)

14 сакавіка калектыў супрацоўнікаў жывёлагадоўчага аб'яднання калгасных ферм, дробнай жывёлагадоўлі і конекіраўніцтва Заходняй вобласці звярнуўся з прапановай да кіраўніцтваў жывёлаі конегадоўлі Наркамзема БССР з прапановай вызначыць рад пунктаў па правядзенню социялістычнага спаборніцтва па разгортванню жывёлагадоўлі, захаванню маладняка, арганізацыі працы на фермах і інш. Аднак, дагэтуль мы ніякага адказу не атрымалі. Просьба праз вашу газету ўздзейнічаць на вашы арганізацыі аб прыняцці выкліку на правядзенне социялістычнага спаборніцтва.

По даручэнню калектыва: БЕЛІКАЎ, РАЙХЛІН.

АД РЭДАКЦЫІ: Публікуемае намі вышэй пісьмо работнікаў жывёлагадоўчага аб'яднання Заходняй вобласці ліпні раз сведчыць аб бюракратызме і косласці апарата Наркамзема.

Як можна чакаць ад такога апарата разгортвання социялістычных метадаў работы на фермах і ў калгасах, калі непасрэдна ў Наркамземе гэта справа ігнаруецца?

Мы пытаемся: дакуль партыйны камітэт і профсаюзныя арганізацыі Наркамзема будуць ігнараваць социялістычныя метады працы?

ПЛАДЫ НАРКАМЗЕМАЎСКАЙ ФУНКЦЫЯНАЛКІ

Паўднёвыя раёны БССР пачалі ўжо араць. Праз дзень-два пачнецца масавая сяўба. Але насенне яшчэ не падрыхтавана — ні адзін грам насення не пратручан.

У МАЗЫРЫ, ЕЛЬСКУ і наогул у ПАЛЕСКІХ раёнах зусім няма фармаліна і іншых атрутных матэрыялаў. Не ўсе сігналы з раёнаў Наркамзем ніякага адказу не дае, хоць у Беларусі ёсць фармаліна столькі, колькі трэба, каб пратруціць насенне для ўсяго яравога кліна.

Яшчэ 7 сакавіка ў БССР было завезена 18,5 тоны фармаліна (поўнасцю па плану). Трэба было толькі яго неадкладна размеркаваць і разаслаць у раёны. Але ніякага плана размеркавання атрутных матэрыялаў у Наркамземе не аказалася. Спачатку ў Наркамземе гэту работу даручылі т. БЕРКОЎСКАМУ. Ён пратрымаў гэты план у сябе цэлы месяц і, нічога не зрабіўшы, перадаў яго ў сектар планавання тав. ПІСАРЧЫКУ. У гэтым сектары план зноў праляжаў цэлы месяц, а калі фармалін прыбыў, Наркамзем адмовіўся ад яго размеркавання і перадаў гэту справу ў аб'яднанне па барацьбе са шкоднікамі.

Аднак, відаць, апарат гэтага аб'яднання сам адчувае патрэбу ў ачыстцы ад розлага пустазелля.

Справу размеркавання фармаліну аб'яднанне даручыла тав. Панфілаву, які, седзячы ў Маскве ў камандзіроўцы, механічна размеркаваў фармалін па раёнах і тэлеграфна паведаміў у Менск, куды колькі трэба занарадзіць.

Аб'яднанне слепа праштампавала «дырэктыву» Панфілава. У выніку Віцебску адпраўлена на 150 кілограм больш, чым яму трэба, Менску — на 200 кілограм, Бабруйску — на 200 кілограм, а Гомелю для палескіх раёнаў недадалі 500 кілограм фармаліна.

Лішні фармалін, адпушчаны менскай і віцебскай базам, з-за злачынных адносін да хавання такога каштоўнага матэрыяла ў флаконах быў разбіт. Пасланыя атрутныя матэрыялы ў Гомель для палескіх раёнаў праляжалі 9 дзён у вагонах, а 27 сакавіка начальнік ст. Гомель тав. ВОЛЬСКІ выкінуў з вагонаў увесь фармалін, флёр і інш. атрутныя матэрыялы, катэгарычна адмовіўшыся ад пасылкі гэтых матэрыялаў у раёны.

У выніку такіх злачынных адносін да адказнейшай справы значная частка раёнаў БССР не маюць матэрыялаў для пратручвання насення.

ДВАРЭЦКІ.

ДЗІЎНАЕ МАЎЧАННЕ ПРАКУРАТУРЫ БССР

За апошні час у «**Звяздзе**» друкавалася нямала матэрыялаў, сігналізуючых аб варварскім знішчэнні жывёлы ў асобных раёнах і адсутнасці належнай барацьбы мясцовых арганізацый супроць дзейнасці кулацкіх элементаў у гэтым пытанні.

Вось некаторыя найбольш трывожныя сігналы, паданыя на старонках нашай газеты.

5 САКАВІКА. «Прыцягнуць да судовай адказнасці вінаватых у масавым забоі цялят у Быхаўскім, Гарадоцкім, Смалявіцкім раёнах». Факты:

Па Быхаўскаму раёну за апошнія 10 месяцаў зменшылася свіней на 10.431, малочнай жывёлы — 3.725, авечак — 453. За два месяцы ў раёне зарэзана 1500 цялят — 70 проц. усяго ацёлу.

У Смілавічах бюракраты з райжывёлагадоўнання сваім галавацяпскім планаваннем авансам спісваюць у расход цялят, узаконьваюць знішчэнне маладняка.

У Гарадоцкім раёне за год буйнай жывёлы паменшылася на 5 тыс. галоў. Знішчана звыш 2 тысяч цялят гадавога ўзросту.

9. САКАВІКА. «Шкодніцкае гняздо ў соўгасе «Комсомольская правда». Гэтым допісам намеснік начальніка палітаддзела соўгаса тав. Ігаеў і памочнік начпалітаддзела па комсамольскай рабоце тав. Напрэеў сігналізавалі, што дырэктар соўгаса **Мосін** і дырэкцыя **Аршанскага** свінагадоўчага трэста патураюць злачыннай шайцы ў яе жульніцкіх махінацыях па знішчэнню свіней.

15 САКАВІКА. «Беспрытульная ферма кроўных рысакоў» — сігналізавалася аб запалзе фермы народзістых коняй і фармальна-бюракратычных адносінах да гэтай справы работнікаў Наркамзема.

20 САКАВІКА. «Пад суд ашуканцаў і жулікаў» — гутарка ішла аб злачынна-фармальных адносінах ветперсанала да абслугоўвання ветэрынарнай дапамогай коняй у Парыцкім раёне.

Факты такія, што не могуць не прыкаваць да сябе ўвагу пракуратуры. Гэтыя факты патрабуюць не толькі ўвагі, а неадкладнага ўмяшання і рэагавання.

На справе-ж мы гэтага не бачым.

Прынялі якія-небудзь меры да канкрэтных злачынцаў жывёлы? Думаюць прыняць?

Невядома. Мясцовыя органы пракуратуры адмоўчваюцца. Маўчыць і пракурор рэспублікі тав. **Кузьмін.**

Нават няма адказу на артыкул «**Злачыннае адміністраванне**» («Звязда», № 55) **аб парушэннях рэволюцыйнай законнасці пракурорам Наркамюста БССР ГАФТАМ** у часе яго «работы» па ільназагатоўках у Быхаўскім раёне».

Загадчае маўчанне, загадчае і нецярпімае.

Вы, моў, напісваеце, мы будзем начытваць...

Як зразумець такую «тактыку», тав. Кузьмін!

Органы пракуратуры павінны быць асабліва чулымі да сігналаў друку і весці рашучую барацьбу супроць малейшых бюракратычных спроб змазаць узнятае пытанне ў друку, тым больш, калі гутарка ідзе аб злосным сабатаванні дырэктыў партыі і ўрада і фактах яўнага шкодніцтва.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ТОРФСЕЗОНА

Кіраўніцтва завода патрабуе аздараўлення

Падрыхтоўка да торфсезона на заводзе «**Чырвоная Беларусь**», Бы хаўскага раёна, праходзіць зусім нездавальняюча.

Арганізаваны набор рабочай сілы зрываецца. Інспектарамі вярбоўкі былі вылучаны людзі, нездольныя справіцца з гэтай работай. Работа інспектароў і іншых упаўнаважаных не праверяецца.

Рамонт баракаў ідзе вельмі марудна. Будаўніцтва новых жыллёвых памяшканняў зрываецца з прычыны недахвату лесаматэрыялаў, якія не былі своечасова падвезены на будаўніцтва. Да гэтага часу Белторф не даслаў заводу каштарыса.

Зарплата рабочым і возчыкам торфу не выплачана лішэ за студзень. Грошы ёсць, але яны скарыстоўваюцца на іншыя патрэбы. Невыплата зарплаты зрывае вярбоўку рабочай сілы.

Дырэктар Юдкін нічога не робіць па падрыхтоўцы да торфсезона. Ён арганізоўвае папойкі, а работа зрываецца.

Працоўная дысцыпліна зусім слабая, кіруючы апарат працуе дрэнна. Цяперашняе кіраўніцтва не можа забяспечыць паспяховай падрыхтоўкі да торфсезона.

КОМСАМОЛЕЦ.

Праграма павялічана, а падрыхтоўка не вядзецца

У мінулым годзе торфзавод «**Свабода**» выканаў план торфаздабычы на 84,2 проц. Праграма гэтага года ўстаноўлена ў 23 тыс. тон супроць леташняй у 20 тыс. Не гледзячы на гэта, падрыхтоўка да торфасезона праходзіць дрэнна.

Замест патрэбных 600 рабочых завербавана толькі 180. Вярбоўшчыкі бяздзейнічаюць. Прадстаўнік торфзавода ў Старадпрожскім раёне за дзве дэкады сакавіка не завербаваў ніводнага рабочага. Усяго ў раёне завербавана 6 рабочых замест 226 па плану. Вярбоўку праводзіў **Кавалеўскі** — чалавек класава-варожы, выключаны з радоў партыі. Цяпер дырэктар завода **Танроўскі** даў Кавалеўскаму другую работу.

На заводзе не вядзецца ніякая падрыхтоўка да сустрэчы новых рабочых. Вокны ў бараках без шыбаў. Паспельныя прылады ёсць толькі на 50 проц. Да 15 сакавіка трэба было скончыць рамонт сталоўкі, але ён пачаўся толькі цяпер. Начальнік ОРС'а **Сапожнікаў** п'янствуе, за кароткі час растраціў больш 300 руб. На заводзе не хапае лапат і іншых прылад.

Белторф павінен дапамагчы заводу падрыхтавацца да сезона.

БУШКОЎ.

УЛІКАВЫЯ МАХІНАЦЫІ БЕЛТОРФА

СНК СССР у пастанове аб максімальным скарачэнні справаздачнасці рэзка завастрыў увагу на момантах скажэння ўстаноўленай і зацверджанай ЦУНХУ СССР справаздачнасці. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы павінны прыцягвацца да судовай адказнасці.

Аднак, не гледзячы на гэту пастанову, Белторф сістэматычна скажае ўстаноўленую справаздачнасць. Робіцца гэта з мэтай «очковтирательства» і ўтойвання буйнейшых гаспадарчых прарываў, якія ёсць у Белторфе.

Кіраўніцтва Белторфа дала заводам спецыяльную дырэктыву, якая скасоўвае рад пунктаў ва ўстаноўленай справаздачнай картцы № 2. Гэтая картка (раздзел II, радок 8) прадугледжвае ўлік рабочай сілы і фондаў зарплаты як па плану, так і па «нецэнзаваму будаўніцтву», якое праводзіцца т. зв. «гаспадарчым спосабам». Белторф устанавляе свой парадак уліку: улічваюцца рабочыя, занятыя на пагрузачна-разгрузачных работах па вывазцы прадукцыі спажыўцу г. зн. рабочыя, якія адносяцца да групы незаводска га транспарта і павінны ўлічвацца ў 9-м радку гэтай-жа карткі.

У 12-м радку прадугледжваецца ўлічваць работнікаў, занятых у жыллёвай гаспадарцы і ў культурна-бытавых установах. Аднак Белторф прапануе сваім прадпрыемствам паказваць у гэтым радку малодшы абслугоўваючы персанал.

Рабочых, якія павінны ўлічвацца як падсобныя, Белторф прапануе ўлічваць па трох відах: па вытворчасці, вывазцы і капітальнаму будаўніцтву. Таксама прапануецца размяркоўваць агульна-заводскія выдаткі і агульна-заводскі штат служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і малодшага абслугоўваючага персанала.

Работнікі ўліку і планавання ведаюць, што т. зв. «агульныя» выдаткі не могуць трапіць проста на поўны від прадукцыі, а павінны размяркоўвацца на ўсе віды гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства. Такое размеркаванне выклікаецца необходнасцю вызначыць сабекошт асобных відаў прадукцыі шляхам складання планавай або фактычнай калькуляцыі.

Існуючая ў Белторфе сістэма ўліку скажае сапраўднае становішча па заводах і разбуханне непрадукцыйных штатаў.

Такая практыка вядзення ўліку і справаздачнасці невыпадкова. Яна звязана з усёй сістэмай работы Белторфа.

ТКАЧОЎ.

ЗАБЫТА І ЗАКІНУТА...

Міхалеўская торфарцель (Уваравіцкі раён) павінна ў гэтым годзе здабыць **22 тыс.** тон торфу для Гомельскага маргарынавага завода і цагельнаў Гомельскага керамтрэста.

Не гледзячы на тое, што да пачатку сезона засталося мала часу, план вярбоўкі рабочай сілы не выканан і напалову. Не падрыхтавана тарфяное поле: з 22 клм. магістральных канаў па плану не выкананa ні адной. З-за бяздзейнасці ўпаўнаважанага керамтрэсту **Злотнікава** на балоце ляжыць 754 тоны торфу. Па віне загадчыка Уваравіцкага райза **Салаўёва** калгасы, прымацаваныя да арцелі, не вывезлі 1.200 тон торфу для ўгнаення пазеў.

Уваравіцкі райвыканком зусім не цікавіцца работай торфарцелі, не кантралюе і не дапамагае ёй.

За 1933 год арцель мела **12.000** руб. страт. Спажыўцы торфу не плацяць своечасова грошай. Арцель у цяжкім фінансавым становішчы. Старшынёй з'яўляецца **Пяўцоў** — былы арандатар маёнтку, яго намеснік Волкаў — п'яніца, якога знялі за бяздзейнасць з работы ў райсаюзе.

А. КАЗІМІРАЎ.

А. ЕНУКІДЗЕ

15 ГОД НА ПАСТУ СТАРШЫНІ ВЦВК

15 год таму назад, 30 сакавіка 1919 г., М. І. Калінін быў выбран старшынёй ВЦВК. Абранне яго на гэты пост супадае з зацвярджэннем на VIII з'ездзе РКП(б) партыйнай праграмы і прынцыпам ранняў аб адносінах да сярэдняга сялянства. Гэтымі рашэннямі партыя даручыла рабоча-сялянскаму ураду строга праводзіць палітыку годы пролетарыята і бяднейшага сялянства з сярэднім сялянствам на гэтай аснове ўмацоўваць совецкую дзяржаву.

Прадстаючую ролю М. І. Калініна ў вырашэнні гэтых вялікіх задач вельмі добра вызначыў В. І. Ленін у сваім выступленні на пасяджэнні ВЦВК 30 сакавіка 1919 года, высоўваючы кандыдатуру М. І. на пост старшыні ВЦВК.

У сваім выступленні В. І. Ленін гаварыў:

«У нас трэба зрабіць так, каб на чале совецкай улады стаў таварыш, які мог-бы паказаць, што наша пастанова аб адносінах да сярэдняга сялянства будзе сапраўды праведзена ў жыццё. Магчыма трэба знайсці таварыша, які далкам паставіў-бы сваёй задачай правядзенне кіруючай лініі партыі ў адносінах да сярэдняга сялянства»

Такога работніка, які ўмеў-бы праводзіць лінію партыі ў адносінах сярэдняга сялянства, умацоўваў-бы сувязь цэнтра з месцамі, злучаў-бы ў сабе жыццёвы вопыт і знаёмства з жыццём сярэдняга селяніна, В. І. Ленін бачыў у М. І. Калініне. 15-гадовая работа М. І. Калініна на пасту старшыні ВЦВК і 10-гадовая работа старшынёй ЦВК СССР паказала, што М. І. Калінін бліскуча спраўляецца з усі кладзенымі на яго партыяй такімі вялікімі і важнымі задачамі.

Заўсёды бадзёры і энергічны, М. І. Калінін, як ён сам выражаецца, «не мудрствуя лукаво», на практыцы ператварае ў жыццё рашэнні партыі і ўрада і служыць у гэтых адносінах прыкладам для акружаючых яго работнікаў. Уладаючы найлепшымі асабістымі якасцямі чулага і ўмудронага жыццёвым вопытам чалавека, заўсёды даступны для шырокіх працоўных мас, умеючы пры самых складаных акалічнасцях, знаходзіць з імі агульную мову, М. І. Калінін за гэтыя 15 год прарабіў сапраўды вялікую работу па збіранню рэволюцыйных сіл пад сцягі совецкай, па ўмацаванню сувязі партыі з масамі, па ўмацаванню саюза рабочага класа з сялянствам.

Не гледзячы ні на якія небяспекі і пагрозы з боку ворагаў совецкай улады, М. І. Калінін з невялікай, але цесна згуртаванай групай работнікаў пабываў у самых аддалёных кутках нашай краіны і на франтах грамадзянскай вайны. У абставінах абвостранай грамадзянскай вайны, калі белыя арміі займалі ўсю Сібір і Поўнач, а з паўдня падыходзілі да Тулы, М. І. Калінін нямала папрацаваў пад умацаваннем Чырвонай арміі, у асаблівасці праяўляючы клопаты аб снабжэнні і спаражэнні. Маючы сувязь з масамі, М. І. Калінін выяўляў няправільныя дзеянні мясцовых совецкіх у адносінах сярэдняга сялянства і ўстраняў на месцы ўсё тое, што перашкаджала ўмацаванню саюза рабочага класа з сярэднім сялянствам. Тым самым ён умацоўваў базісы пролетарскай рэволюцыі.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі і аднаўлення разбуранай імперыялістычнай і грамадзянскай войнамі народнай гаспадаркі патрабаваў ад партыі і совецкага ўрада вялікай увагі к таму, каб усё наша гаспадарчае будаўніцтва развівалася па социялістычнаму шляху, выцясняючы капіталістычныя элементы.

Шматлікія запісы выступленняў М. І. Калініна на мясцах і ў цэнтры за перыяд першых год нэпа з'яўляюцца бліскучай ілюстрацыяй таго, наколькі ён глыбока разумеў лінію партыі і разам з тым у даступнай для шырокіх мас форме ўяўляў задачу «стрыжкі» капіталістычных элементаў на карысць социялізма.

Ажыццяўляючы задачу непасрэдных зносін вышэйшых прадстаўнікоў совецкай улады з сялянствам, М. І. Калінін накапіў велізарны вопыт у справе кіраўніцтва сялянствам з боку рабочага класа і ўцягнення бяднацка-сераднацкіх мас у социялістычнае будаўніцтва.

У маі 1924 г. М. І. Калінін на XIII з'ездзе партыі зрабіў даклад аб рабоце ў вёсцы, у якім ён разгарнуў карціну адбываючагася ў ёй росту добрабыту мас, што, разумеецца, забяспечваецца цвёрдым правядзеннем палітыкі ўмацавання саюза рабочага класа з сялянствам. У пастанове XIII з'езда па дакладу М. І. Калініна была яшчэ раз пацверджана непахісная рашучасць партыі ўмацоўваць саюз рабочага класа з сялянствам. У пастанове XIII з'езда было сказана: «Пры вырашэнні пытання аб рабоце партыі ў вёсцы неабходна выходзіць з асноўнай для цэлага гістарычнага перыяда задачы—ажыццяўлення саюза рабочага класа з сялянствам».

І калі ў пачатку 1925 г. партыя паставіла перад совецкімі задачу паляпшэння іх работы з масамі і расшырэння з імі сувязяй, то М. І. Калінін сваім вопытам дапамог паспяховаму завяршэнню работы нарад на пытаннях совецкага будаўніцтва, у рэзультаце чаго быў перагледжан рад законаў, рэгулюючых дзейнасць мясцовых советаў, умацована іх матэрыяльная база і пакладзен пачатак стварэнню бюджэта ў сельсоветах.

У той час, як розныя антыпартыйныя групоўкі, скажаючы лінію партыі, шарахаліся або на шлях перагаблядання ўсяго сялянства, у тым ліку і серадняковаў і беднякоў, або станавіліся на шлях ущчнення ў социялістычнае будаўніцтва зноў такі ўсяго сялянства, у тым ліку і кулакоў,—М. І. Калінін ўсё так-жа цвёрда праводзіць лінію партыі, г. зн. палітыку ізаляцыі кулака і ўмацавання саюза рабочага класа з сярэднім сялянствам.

На аснове генеральнай лініі партыі совецкая дзяржава перамагла гаспадарчую разруху, ліквідавала беспрацоўе, аднавіла народную гаспадарку, моцна падняла культуру і матэрыяльнае становішча мас горада і вёскі і, праводзячы правільную ленінскую нацыянальную палітыку, умацавала брадкае супрацоўніцтва народаў Саюза ССР.

Усё гэта дапамагло і ўмацаванню абароназдольнасці нашай краіны і ператварэнню яе ў сур'ёзны фактар міра.

Пад кіраўніцтвам М. І. праведзены парады па пытаннях совецкага будаўніцтва ў 1928, 1929, 1930 гг., мэтай якіх было павярнуць советы тварам да вытворчасці і калгаснага будаўніцтва. І ў гэты перыяд М. І. прадаўжае захоўваць свае традыцыі шырокай сувязі з масамі як праз сваю прыёмную ў Маскве, так і ў асаблівасці выездамі на месцы, аж да самай вёскі. Гэтыя выезды М. І. ў вёску з'яўляюцца наглядзімі паказальнікамі таго, як рабочы-большэвік, настаўлены на чале совецкага ўрада, увасабляе кіраўніцтва рабочага класа сялянствам.

Тут трэба падкрэсліць, што М. І. Калініна як рабочыя, так і сялянства заўсёды сустракаюць як свайго, бо як тыя, так і другія адноль кава лічаць яго блізкім. Яно так у сапраўднасці і ёсць. Бо В. І. Ленін яшчэ 15 гадоў таму назад гаварыў, што рабочыя здолелі пераканацца, што М. І. Калінін мае ўмелы падыход да шырокіх слаёў працоўных мас і там, дзе прапагандыст і агітатар не маглі падысці да іх «па-таварыску і ўмела, т. Калініну ўдавалася вырашыць гэтую задачу». Мы цяпер можам сказаць, што за 15 гадоў работы старшынёй ВЦВК і за 10 работы старшынёй ЦВК СССР працоўныя ўсёй нашай краіны змаглі пераканацца, што гэтыя якасці ў М. І. Калініна захаваліся па сённяшні дзень. Ні гады, ні займаемае ім палажэнне ў совецкай дзяржаве,—нішто не змагло разбурыць гэтай бліскучай яго рысы —умення папросту гаварыць з масамі па самыя сур'ёзнейшыя тэмы класавай барацьбы і социялістычнага будаўніцтва і пераконваць масы ў правільнасці нашай палітыкі.

М. І. Калініну прыходзіцца выступаць перад самай разнастайнай аўдыторыяй. Ён выступае перад рабочымі Ленінграда, Тулы, Масквы, Харкава, Баку, Растова, Урала, Сібіру, Далёкага-Усхода і многіх іншых абласцей, выступае перад сялянамі (адпаасобнікамі і калгаснікамі) не толькі рускіх раёнаў, але і Узбекістана, Туркменіі, Закаўказзя, Татарыі, Крыма і т. д. Выступае М. І. Калінін перад галадаючымі ў 1922 г., на жночых сходах, на сходах ваенных работнікаў, вучнёўства, спецыялістаў-інжынераў і тэхнікаў, настаўнікаў, пісьменнікаў, акадэмікаў і інш. І ва ўсіх гэтых выступленнях каштоўна тое, што ён умее знайсці і развіць тую асаблівую задачу, якая з'яўляецца найбольш важнай у даны момант для совецкай дзяржавы, прычым расказаць аб ёй у такой форме, каб яна ўвайшла ў свядомасць давай аўдыторыі.

Гэтыя якасці для дзяржаўнага дзеяча совецкай краіны з'яўляюцца каштоўнейшым скарбам, бо яны дапамагаюць падняцыю многамільённых мас, аб'яднанню іх вакол партыі і совецтаў для барацьбы за паспяховае вырашэнне задач будаўніцтва социялістычнага грамадства.

Нас, блізка працуючых з М. І. Калініным работнікаў, вельмі радуе тое, што ён па-ранейшаму астаецца фізічна моцным і бадзёрым, што ён увесь час узбагачае свае веды і з'яўляецца верным саратнікам правадыра нашай партыі тав. Сталіна. Гэта аблягчае нашай дзяржаве падняць яшчэ больш масы горада і вёскі на барацьбу за пабудову социялістычнага грамадства, і перш за ўсё на барацьбу за ператварэнне ў жыццё рашэнняў XVII з'езда нашай партыі.

Шчыра жадаю М. І. Калініну яшчэ многія гады працаваць з намі і кіраваць намі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Перадавы артыкул „Правды"—29 сакавіка

ПАРТОРГІ ТРАНСПАРТА, АПРАЎДАЙЦЕ ДАВЕР'Е ПАРТЫІ

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) паклаў увесці ў дапамогу палітаддзелам транспарта інстытут партыйных арганізатараў на станцыях, у паравозных і вагонных дэпо, у дыстанцыях шляху і на абменных пунктах. Гэтымі днямі першыя 300 такіх прышоў, дасканала адабраных Цэнтральным Камітэтам на гэту работу, накіраваліся на месца назначэння. Чыгуначны транспарт атрымаў першыя тры сотні і ў бліжэйшы час атрымае дзве-тры тысячы лепшых, праверваных большэвіцкіх-арганізатараў.

«ПАРТАРГАНІЗАТАР БУДЗЕ ЗНАХОДЗІЦЦА САКРАТАРОМ ПЯРВІЧНАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ СТАНЦЫІ, ДЭПО І Т. Д.; ЁН БУДЗЕ ВЫКАНЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ КАНКРЭТНАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАРТЫЙНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТАЙ, АПІРАЮЧЫЦЦА НА ПРОФСАЮЗ, КОМСАМОЛ І ІНШЫЯ МАСАВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, НЕ ПАРУШАЮЧЫ ПРЫ ГЭТЫМ, А ЎСЯМЕРНА ЎМАЦОЎВАЮЧЫ АДЗІНАНАЧАЛЛЕ», — так вызначае Цэнтральны Камітэт правы і абавязкі партыйнага арганізатара на транспарце. У гэтай ліслай фармуліроўцы змяшчаецца праграма работы парторга, увесь аграмадны дыяпазон яго дзейнасці, змяшчаюцца і метады яго работы.

Парторгі будуць на станцыях, у дэпо, у дыстанцыях шляху і на абменных пунктах. Адсюль—дыферэнцыяцыя задач парторгаў. Парторг станцыі павінен усямерна ўмацоўваць станцыю, як рашаючы вагар паравозак, павінен ПАЛІТЫЧНА забяспечыць выкананне плана пагрузкі і дабіваца правільнага, чоткага руху паяздоў. У паравозных дэпо задача парторга—забяспечыць своечасовы і добраякасны рамонт паравозаў і ўсямерна ўмацоўваць спаравую язду. Адпаведна дыферэнцуюцца і задачы парторгаў вагонных дэпо, абменных пунктаў і дыстанцый шляху.

Парторг, арганізуючы і ўзначальваючы комуністаў, апіраючыся на профсаюз, на комсамол, на рабочых-ударнікаў, абавязан ПАЛІТЫЧНА забяспечваць поспех работы на сваім участку. РАЗАМ З МАСАМІ, НА ЧАЛЕ МАС—гэта галоўнае. Парторг ні ў якай меры не павінен падмяняць начальніка станцыі, дэпо і т. д., а наадварот, усямерна ўмацоўваць і ахоўваць непарушнасць адзінаначалля.

Але там, дзе парторг бачыць расхлябанасць, разгільдзяйства саміх камандзіраў, дзе камандзіры не змагаюцца за дысцыпліну, за парадак, за выкананне плана пагрузкі, за эфектыўнае выкарыстанне рухомага саставу,—там парторг абавязан з большэвіцкай настойлівасцю дабівацца выкрыцця сабатажнікаў. Гэтых сабатажнікаў, разгільдзяеў і чыноўнікаў нямала на станцыях, у дэпо, на абменных пунктах, як нямала іх і ў дарожных кіраўніцтвах і ў самым НКШЗ. Большэвіцкая непрымірымасць да згіднасцяй, сабатажу і недысцыплінаванасці, уменне бачыць згіднасці і знаходзіць канкрэтных вінаватых, быстра і да канца выкрываць іх, быстра, аператыўна і да канца знішчаць недахопы, — вось якімі якасцямі павінен улядаць парторг на транспарце.

Транспарт працуе дрэнна, і ў гэтым нясуць віну перш за ўсё комуністы-чыгуначнікі. Многія з іх не апраўдваюць высокага звання членаў большэвіцкай партыі, а некаторыя нават забруджваюць, пэцкаюць гэта званне. «МНОГІЯ КОМУНІСТЫ, —сказана ў пастанове Соўнаркома і ЦК ад 23 сакавіка, — З'ЯЎЛЯЮЦЦА МЕНШ ДЫСЦЫПЛІНАВАНЫМІ, ЧЫМ БЕСПАРТЫЙНЫЯ РАБОТНІКІ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТА, А НЕКАТОРЫЯ З ІХ ДАХОДЗЯЦЬ У СВАЁЙ НЕДЫСЦЫПЛІНАВАНАСЦІ ДА ТАГО, ШТО ІХ ЦЯЖКА АДРОЗНІЦЬ АД «ОЧКОВТИРАТЕЛЕЙ», ДЭЗАРГАНІЗАТАРАЎ І ШКОДНІКАЎ». Што можа быць больш жорсткім чым гэта ацэнка? Тут задача парторгаў і палітаддзелаў ясна: бязлітасна выкрываць і выганяць з партыі прахвостаў з партыйным білетам у кішэні, разлажыўшыхся, стаўшых па сутнасці ворагамі пролетарскай дзяржавы.

Але асноўная маса комуністаў на транспарце, безумоўна, — здаровая, адданая партыі. Бяда тут заключаецца ў тым, што ў людзей прытулілася пачуццё адказнасці, людзі настолькі зжыліся, прызвычаіліся да недахопаў, што перасталі іх заўважаць. Аб'ектыўна нямалая частка комуністаў на транспарце перастала быць комуністамі ў поўным сэнсе гэтага слова. Бо комуніст—гэта перш за ўсё актыўны змагар за палітыку партыі, за яе рашэнні, непрымірымы вораг разгільдзяйства і бездапказнасці, гэта арганізатар мас, лепшы работнік, падаючы прыклад усім астатнім.

Тав. СТАЛІН не раз указваў, што на чыгунцы занадта многа адміністрыруюць, камандуюць і вельмі мала вучаць, выхоўваюць. Гэта ўказанне правадыра парторгі павінны пакласці ў аснову сваёй работы. Трэба так арганізаваць справу, каб людзі вучыліся на добрых узорах работы, авалодвалі тэхнікай транспарта. Жорсткае, неўмалімае патрабаванне жалезнай дысцыпліны ад кожнага работніка трэба спалучаць з глыбокай выхаваўчай работай, з настойлівай прапагандай і агітацыяй за социялістычныя адносіны да працы.

Уся краіна заслужана адзначае геройчны прыклад пролетарскай дысцыпліны і пільнасці, праяўленай машыністам ТОМКЕ і яго памочнікам ЯКАЎЛЕВЫМ. Яны выратавалі кур'ерскі поезд ад немінучай гібелі. Яны не збянтэжыліся перад жудаснай небяспекай і чэсна, да канца выканалі свой доўг перад бацькаўшчынай. Такіх герояў, як Томке і Якаўлеў, дысцыплінаваных і чэсных работнікаў, адданых сваёй бацькаўшчыне, шмат на транспарце. Але яны непрыкметны, таму што яны скромныя людзі. Зрабіць іх ПРЫКМЕТНЫМІ—пярвейшы абавязак парторга. Трэба ўсяляк выпучаць і заахвочваць такіх людзей. Трэба падымаць іх на шчыт славы. Трэба на іх прыкладах вучыць усіх астатніх. Трэба выхоўваць тысячы і тысячы такіх людзей, як паравозныя Томке і Якаўлеў, як грозненскі дыспетчар КУТАФІН, як дзбальцаўскі змазчык НАГОРСКІ.

Перад парторгамі, як сакратарамі пярвічных партыйных арганізацый на транспарце, стаіць задача ажыўлення партыйна-масавай работы ў нізавых гаспадарчых звеннях транспарта—дэпо, на станцыі і т. д. Гэта работа да апошняга часу была ў запушчаным стане. Палітаддзелы сёе-тое зрабілі ў гэтых адносінах, але вельмі мала, каб гаварыць аб якіх небудзь поспехах.

УЦЯГНУЦЬ КОЖНАГА КОМУНІСТА Ў АКТЫЎНАЕ ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ, УЗБРОІЦЬ ЯГО ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНА, ПАДНЯЦЬ У ІМ ПАЧУЦЦЁ АДКАЗНАСЦІ ЗА ДАРУЧАНУЮ СПРАВУ, — такая задача парторга. І чым хутчэй гэтага дабіецца парторг, тым хутчэй ён забяспечыць для сябе стварэнне шырокага актыва комуністаў, які дапаможа яму ў рабоце.

Кожны паасобны комуніст з усімі яго асаблівасцямі, клопатамі, здольнасцямі павінен быць вядомы парторгу. ВЕДАЦЬ КОЖНАГА КОМУНІСТА, як самога сябе—такі дэвіз партыйна-масавай работы. Ад кожнага комуніста трэба ўзяць усё, што ён можа даць. Кожнаму чэснаму комуністу трэба дапамагчы вырасці на рабоце, праявіць свае здольнасці.

Чыгуначны транспарт—зараз самы адказны і важны ўчастак социялістычнага будаўніцтва, паколькі ён адстае і становіцца бар'ерам, аб які пачынае спатыкацца ўся наша эканоміка. Без умацавання нізавых партыйных арганізацый, без стварэння сур'ёзнага актыва з перадавых беспартыйных рабочых праблема чыгуначнага транспарта не можа быць вырашана.

І першы абавязак парторга на транспарце—СКАЛАЦІЦЬ ГЭТЫ АКТЫЎ, ВЫХОЎВАЮЧЫ І ЗАГАРТОЎВАЮЧЫ ЯГО НА ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ.

ВЫСТУПЛЕННЕ САБАТАЖНІКА

(Ад спецыяльнага карэспандэнта „Звязды")

МАГІЛЕЎ.

26 сакавіка адбыўся сход партактыва Магілеўскага ўзла. Сход абгаварыў пастанову ЦК і СНК аб планаванні перавозак і рабоце мясцовых органаў НКШЗ.

У спрачках было антыпартыйнае выступленне інжынера на цёплатэхніцы, комуніста Сямёнава, які выказаў сваю [illegible]ду з пастановай партыі і

— Я—заявіў ён,—не згодзен з той часткай рашэння ЦК і СНК, якая дае правы начальніку станцыі накладваць спагнанні на агентаў другіх служб, што не выконваюць яго распаражэння. Гэта робіць начальніка станцыі універсалам.

Сход не даў Сямёнаву рашучага адпору. Толькі сакратар парткома станцыі тав. Крук правільна кваліфікаваў яго выступленне як антыпартыйнае. Аднак, ні ён, ні другія не далі разгорнутай крытыкі выступлення Сямёнава. А сакратар парткома дэпо Панфіловіч заявіў, што «Сямёнаў, відаць, не прачытаў добра пастановы, таму так выступаў». Гэтым Панфіловіч пастараўся змазаць палітычнае значэнне варожага выступлення Сямёнава. «Тлумачэнні» Панфілові ча сход не раскрытыкаваў.

Большасць іншых выступленняў зусім была пазбаўлена самакрытыкі. Так, майстар механічнага цэху паравознага дэпо Шульгоўскі, гаворачы аб недахопах вагоннага ўчастка, зусім абыйшоў абгаворваючую пастаноўку работы ў сваім цэху. А ў яго цэху варштаты не ачышчаюцца, слабая дысцыпліна, заказы вагоннага ўчастка, які яшчэ не мае свайго механічнага цэха, сістэматычна не выконваюцца.

Рэвізор руху Тупчанка таксама не паказаў у выступленні недахопаў сваёй работы. А іх многа. Станцыя несвоечасова адпраўляе паязды. 24 сакавіка загадчык маёўраў Пітулін няправільна сфармаваў поезд. Яго прышлося перарад адпраўкай перафармаваць. Ня планава адпраўляюцца дробныя грузы Скурбыта і шоўкавай фабрыкі, а пад планавыя нагрузкі вагоны не падаюцца. Тупчанка не змагаўся з усімі гэтымі злачынствамі.

Сход не быў скарыстан для мабілізацыі октыва на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці, на барацьбу з сабатажнікамі пастаноў ЦК і СНК.

МАШНІЦКІ.

АД РЭДАКЦЫІ: Факты, якія паведамляюцца ў карэспандэнцыі тав. Машніцкага, сігналізуюць аб прытупленні класавай пільнасці ў партарганізацыі Магілеўскага вузла, якое праявілася ў тым, што выступленне сабатажніка пастановы ЦК і СНК не сустрэла патрэбнага большэвіцкага адпору.

ЗМАЗЧЫК-КОМУНІСТ РОЗАЎ НЕ ВЕДАЕ АДЧЭПАК

Фота МАКЛЕЦОВА



Комуніст РОЗАЎ — адзін з лепшых змазчыкаў Сталінградскага вагоннага ўчастка. Тав. Розаў на справе выконвае рашэнні СНК і ЦК аб транспарце. Ён не ведае адчэпак па гарэнню букс, павышае тэхнічныя веды, авалодвае тэхнікай.

НА ЗДЫМКУ—змазчык Розаў за работай.

КІРАЎНІЦТВА ВОДНАГА БАСЕЙНА ПРАВАЛІЛА БУДАЎНІЦТВА СУДНАВЕРФІ

(Ад карэспандэнтаў „Звязды" па Днепра-Дзвінскаму параходству)

XVII з'езд партыі ў пастанове аб плане 2-й пяцігодкі паставіў адной з важнейшых задач будаўніцтва мелкасядзячых суднаў для асваення дробных рэк. **«Карэнным чынам, — гаворыцца ў пастанове, — павінен быць абноўлен і рэканструяван марскі і рэчны флот, а таксама развіта будаўніцтва мелкасядзячых суднаў для выкарыстання мелкіх рэк».**

Як-жа рэалізуе гэту пастанову кіраўніцтва Днепрадзвінскага рэчнога транспарта?

Яшчэ ў лістападзе 1931 г. пастановай Наркамвода і Соўнаркома БССР было пачата будаўніцтва Верхня-Дняпроўскай судаверфі ў Рэчыцы.

Спачатку гэта суднаверф была прызначана для будаўніцтва параходаў. Але летась, у кастрычніку Наркамвод, перадаўшы будаўніцтва суднаверфі кіраўніцтву Днепра-Дзвінскага параходства, прапанаваў арганізаваць у ёй пабудову мелкасядзячых суднаў. Яму-ж былі пераданы сродкі і даручана прыступіць да новага складання праекта будаўніцтва суднаверфі (у сувязі з пераходам на пабудову новага тыпу суднаў).

Доўга ўпіралася кіраўніцтва басейна, не жадаючы прымаць пад сваё веданне верф. Але супроць заданя наркома не пойдзеш. З болем на сэрцы вылучылі камісію, прынялі верф, склалі адпаведны акт і... на гэтым палічылі справу скончанай.

Аб верфі проста забыліся.

— Грошай на першы квартал вам не адпушчана—ветліва заявілі яму ў плапава-фінансавым аддзеле параходства.

Не задаволіўшыся адказам, тав. Малышаў накіраваўся ў сектар будаўніцтва да тав. Осіпава.

— Ідзіце ў суднамеханічны сектар да т. Гірынга, — параіў яму Осіпаў.

— Ідзіце да начальніка басейна т. Пачэбута, — прапанаваў яму Гірынг.

Пасля доўгай хадзьбы з сектара ў сектар т. Малышаў урэшце высветліў, што сродкі на будаўніцтва на першы квартал не адпушчаны таму, што праект будаўніцтва яшчэ не складзен.

Толькі ў студзені, калі ўжо пачаўся новы бюджэтны год, кіраўніцтва басейна заключыла дагавор з Ленінградскім гідраводтрансам на складанне праекту. Заключылі, але не прынялі ніякіх мер, каб паскорыць яго складанне і зацвярджэнне ў адпаведных арганізацыях.

У выніку — да сёнешняга дня праекту яшчэ няма.

З 1-га студзеня 1934 года будаўніцтва спынена.

Куды ні глянь — усюды валяецца будаўнічы матэрыял, загатоўлены яшчэ ў 1931 годзе. Больш 40 проц. яго сапсавана і непрыгодна для скарыстання. Патрачаны на па будову капітал у 500 тысяч руб. — амяртвелы.

На бягучым рахунку, рэчыцкай суднаверфі... 75 кап. Гэта смешна, але горкі факт. Гэта — рэзультат чыноўніцтва, бюракратычнага кіраўніцтва справай, рэзультат злачыннага ігнаравання загаду парткома воднага транспарта і пастановы СНК БССР.

Начальнік будаўніцтва тав. Малышаў не раз прыязджаў у Гомель, патрабуючы прыняцца рашучых мер, пытаючы, што рабіць.

У адказ — глыбокае спачуванне і ніякай канкрэтнай дапамогі.

— Сродкі патрэбны, — настойвае Малышаў.

— Прадай коняй, прадай лесаматэрыям, — раіць начальнік басейна т. Пачэбут.

— Нічога не можам зрабіць, — распісваюцца ў сваёй бездапаможнасці кіруючыя арганізацыі басейна.

Праекту няма. Будаўніцтва замарожана. Сотні тысяч рублёў народных грошай марна прападаюць. Ствараецца яўная пагроза, што пры падобнай злачыннай непаваротлівасці кіраўнікоў Днепра-Дзвінскага басейна будаўніцтва суднаверфі будзе сарвана і ў другім квартале.

А. ДАМБРОЎСКІ,
П. ЛІТВІНКА.

АДКРЫТАЕ ПІСЬМО ПАРТЫЙНЫМ, ПРОФСАЮЗНЫМ І КОМСАМОЛЬСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ гор. МЕНСКА

ЦО нашай партыі «Правда» ў перадавым артыкуле ад 28 сакавіка з усёй вострасцю паставіла перад советамі, перад партыяй і перад кожным комуністам баявую ганаровую задачу — скарыстаць вясну і лета для сур'ёзнай і вялікай барацьбы за чыстату і культуру гарадоў.

Трэба прама прызнаць, што для Менскай партыйнай арганізацыі больш, чым для іншай, задача, вынутая «Правдой», з'яўляецца найбольш актуальнай, найбольш набалелай.

Няма патрэбы яшчэ раз паўтараць аб нашых велізарных поспехах у развіцці і рэканструкцыі гарадской гаспадаркі нашай совецкай краіны і яе сустаўной часткі — г. Менска. Аб гэтым даволі ярка сказана на гарадской партыйнай канферэнцыі, на XV з'ездзе КП(б)Б, гэта з усёй яркасцю паказана таварышом Сталіным у дакладзе на XVII з'ездзе нашай партыі. Аб гэтым сведчаць 78 мільёнаў рублёў, укладзеных у прамыслова-культурнае і жыллёвае будаўніцтва г. Менска ў першай пяцігодцы. Жывымі сведкамі гэтага з'яўляюцца 56 новых прамысловых і грамадска-культурных аб'ектаў, 2180 новых кватэр, пабудаваных у Менску за апошнія гады. У бягучым 1934 г. у будаўніцтва г. Менска ўкладваецца звыш 50 млн. руб.

Трэба асабліва падкрэсліць спецыяльную ўвагу і клопаты Саюзнага ўрада аб добрабыце сталіцы БССР. Усім нам памятна вядомая пастанова ЦВК СССР па дакладу менскага горсовета ў лістападзе мінулага года, дзе адзначана, што «Менск становіцца адным з буйных прамысловых і культурных цэнтраў СССР».

Здавалася-б, што пры такой увазе і дапамозе партыі і ўрада развіццю і рэканструкцыі г. Менска нашым гарадскім совецкім і партыйным арганізацыям засталося па-большэвіцку арганізаваць беражлівыя, социялістычныя, культурныя адносіны да дамоў, кватэр, двароў і вуліц. На самой справе мы часта наглядаем адваротнае: гразь, неахайныя, а ў паасобных выпадках проста варварскія, злачынныя адносіны паасобных комуністаў і беспартыйных да жыллёвага фонда. Больш таго, такія злачынныя адносіны да дзяржаўнай і кааперацыйнай маемасці ў большасці выпадкаў праходзяць беспакарана. Усё гэта ў значнай меры зніжае эфектыўнасць нашых дасягненняў, стварае крыніцы зараз і непармальныя ўмовы жыллёва-комунальнага абслугоўвання працоўных.

Чым вытлумачыць такое становішча? Нічым іншым, як самаўхіленнем нашых гарадскіх совецкіх, партыйных і профсаюзных арганізацый ад важнейшай задачы добрабыту, ад штодзённых клопатаў аб паляпшэнні культурна-бытавога становішча працоўных. Толькі бюракраты і безнадзейныя балбатуны могуць аб'ясніць недобрабыт і гразь аб'ектыўнымі прычынамі, недахватам матэрыялаў і т. д. Неахайнасць, наплявацельскія адносіны камгасаўскіх і жактаўскіх бюракратаў, сапоўна-панскія, пагардлівыя адносіны партгруп жактаў да аграмаднага росту культурных запатрабаванняў мас рабочых і працоўных — вось сапраўдная прычына ўсіх агідناсцяй.

Нельга ні адной мінуты цярпець далей такога становішча.

Справу ачысткі двароў і дамоў, рамонта жыллёвага фонда павінна ўзяць у свае рукі ўся партыйная і пролетарская грамадскасць гор. Менска.

Трэба, каб нашы партыйныя, профсаюзныя і комсамольскія арганізацыі неадкладна абгаварылі перадавы артыкул «Правды» і арганізавалі шырокія масы рабочых на дапамогу сваім падшэфным жактам і домакіраўніцтвам, разгарнулі неадкладна соцспаборніцтва паміж дварамі, домакіраўніцтвамі, вуліцамі на ачыстку жылых і фабрычна-заводскіх дамоў ад гразі, смецця, на ачыстку праўленняў жактаў і домакіраўніцтваў ад чужых людзей, чыноўнікаў і балбатуноў.

Трэба дабіцца таго, каб кожны комуніст і комсамолец асабістым прыкладам арганізаваў і павёў за сабой сваіх суседзяй жыхароў на барацьбу за чысты і культурны двор, за спраўны тратуар, за ўнутрана і знадворна чыстую, пры гожую, добра абсталяваную кватэру.

Гарадскі камітэт партыі прапануе разгарнуць гэту работу, пачынаючы з 1 красавіка з тым, каб да 10 красавіка арганізаваць ачыстку двароў і вуліц, 12 красавіка правесці агульна-гарадскі суботнік чыстаты. Да 1 мая Менск павінен быць прыведзен у чысты культурны выгляд.

Гарадскі камітэт партыі ўпэўнен, што большэвікі і працоўныя г. Менска з натхненнем падхопяць выклік «Правды» і з усёй сур'ёзнасцю возьмуцца за ажыццяўленне адказнай і ганаровай для кожнага комуніста задачы — ператварыць г. Менск ва ўзорную, культурную пролетарскую сталіцу БССР.

Сакратар Менскага гаркома КП(б)Б РЫСКІН.

АБ СКЛІКАННІ ПАРТЫЙНАЙ НАРАДЫ ПА РАБОЦЕ ШКОЛ г. МЕНСКА

Пастанова бюро менскага ГК КП(б)Б

Даручыць аддзелу культуры і прапаганды ленінізма правесці 31 сакавіка 1934 года партыйную нараду па пытанню аб рабоце школ г. Менска, на якую павінны з'явіцца ў абавязковым парадку ўсе члены і кандыдаты партыі партарганізацыі гарана, партыйцы школ, члены парткомаў ВШ, НДІ Ком. выхавання, дзіцячага бюро гаркома ЛКСМБ і старшыні шэфарганізацыі па спісу аддзелу культуры і прапаганды ленінізма і Наркамасветы.

Нарада адбудзецца 31 сакавіка ў памяшканні Дома комасветы (малая зала) у 6 гада. увечары.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТУ

СОЦЫЯЛІЗМ І ПЫТАННІ РОЎНАСЦІ*)

III.

У работах тав. Сталіна марксісцка-ленінскае вучэнне аб социялізме атрымала сваё далейшае геніяльнае развіццё ва ўмовах новай эпохі, эпохі пабеданоснага социялістычнага будаўніцтва. Барацьба за практычнае ажыццяўленне социялізма, за пабудову бясклasавага социялістычнага грамадства адбываецца ў нашай краіне на ўмовах жорсткага супраціўлення класавых ворагаў. Супраціўленне социялізму сказваецца і ў форме ажыўлення чужых марксізму-ленінізму прадстаўленняў аб роўнасці пры социялізме. Варожыя социялізму элементы прабуюць прыкрываць свае атакі супроць палітыкі нашай партыі распаўсюджваннем рэакцыйнай дробнабуржуазнай недарэчнасці аб нібыта ўсеагульным «роўненні», нівеліроўцы патрэбна членаў грамадства пры социялізме.

Вядома, што яшчэ ў 1925 г. тав. Зіноўеў, скаціўшыся на трацкісцкія рэйкі, выступіў са сваім сумна-выдатным артыкулам «Философия эпохи». Супроць марксісцка-ленінскага разумення роўнасці як зніштажэння класаў тав. Зіноўеў высоўвае неакрэслене расплыўчатае патрабаванне «роўнасці изогул».

Лініі партыі на ажыццяўленне ленінскага кааператыўнага плана, на калектывізацыю сельскай гаспадаркі, на зніштажэнне класаў трацкісцкая «новая апазіцыя» супроцьстаўляла рэакцыйна-ўтапічны лозунг: «Даць кожнаму бедняку па каню», лозунг, аснаваны на дробнабуржуазна-дэмагагічным скажэнні патрабавання роўнасці і звязаны не з лініяй на зніштажэнне класаў, а з лініяй на ўвекавечанне дробнай сялянскай вытворчасці.

У свой час тав. Сталін даў знішчальную крытыку зіноўеўскага артыкула «Философия эпохи». Выкрыўшы выстаўлены ў артыкуле дробнабуржуазны лозунг роўнасці, тав. Сталін з выключнай глыбінёй вызначыў марксісцкае разуменне роўнасці:

«Лозунг аб роўнасці ў даны момант ёсць эсэраўская дэмагогія. Ніякай роўнасці не можа быць, пакуль ёсць класы і пакуль ёсць праца кваліфікаваная і некваліфікаваная (гл. «Революцыя і дзяржава» Леніна). Трэба гаварыць не аб неакрэсленай роўнасці, а аб зніштажэнні класаў, аб социялізме» [1]).

У заключным слове па дакладу на XIV парта'ездзе тав. Сталін дае таксама наступныя дадатковыя растлумачэнні па пытанню аб роўнасці:

«Нельга гаварыць аб роўнасці ў асноўным, кіруючым артыкуле, не даючы строгага азначэння, аб якой роўнасці ідзе гутарка — роўнасці сялян з рабочым класам, роўнасці ўнутры сялянства, роўнасці ўнутры рабочага класа, паміж кваліфікаванымі і некваліфікаванымі, або аб роўнасці ў сэнсе знішчэння класаў. Нельга замоўчваць у кіруючым артыкуле чарговыя лозунгі партыі аб рабоце ў вёсцы. Нельга іграць фразай аб роўнасці, бо гэта ёсць гульня з агнём, таксама як нельга іграць фразай аб ленінізме, замоўчваючы чарговы лозунг ленінізма ў пытанні аб сялянстве» [2]).

Няма і не можа быць патрабавання роўнасці «наогул», а ёсць патрабаванне роўнасці з боку розных класаў, і гэтым патрабаванні маюць разлічны рэальны змест. Змест, укладваемы ў лозунг роўнасці пролетарыятам,—гэта зніштажэнне класаў. Хто прабуе ісці далей гэтага, неміну ча прыходзіць да пошласцяй і паклёпаў на марксізм.

Барацьба з дробна буржуазнымі ўраўніцельнымі тэндэнцыямі набывае надзвычай важнае практычнае значэнне ў эпоху гіганцкіх перамог социялізма. Выканаўшы першую пяцігодку, Совецкі Саюз завяршыў на будову фундамента социялістычнай эканомікі. Перамогі социялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі зрабілі социялістычны ўклад пераважаючым і пануючым ва ўсёй народнай гаспадарцы ў цэлым, не толькі ў прамысловасці, але і ў сельскай гаспадарцы. Гэтыя перамогі былі дасягнуты не на шляхах затухання класавай барацьбы, якія прапаведваліся правымі апартуністамі, а шляхам самай жорсткай і абвостранай барацьбы з кулацтвам, ліквідуемым як клас на аснове суцэльнай калектывізацыі, з усімі варожымі элементамі, якія па меры перамог социялізма мяняюць сваю тактыку, скарыстоўваюць новыя формы класавага супраціўлення, прабуюць усялякімі манеўрамі шкодзіць социялізму. У гэтай абстаноўцы астатні варожых партыі ідэалогій нярэдка прабіваюць сабе дарогу, ажыўляючы побач з іншымі антыленінскімі поглядамі і рэакцыйныя дробнабуржуазныя ўяўленні аб роўнасці.

Уцягваемыя ў велізарнай колькасці ў прамысловасць новыя рабочыя кадры не аддзелены кітайскай сцяной ад таго дробнабуржуазнага асяроддзя, з якога яны выйшлі. Апраяа таго на прадпрыемствы прасочваюцца варожыя класавыя элементы, якія прабуюць іграць на яшчэ нязбытых дробнабуржуазных прадрасудках і настроях.

У сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў у чэрвені 1931 г., у якой была разгорнута канкрэтная праграма барацьбы за выкананне нашых гаспадарчых планаў, тав. Сталін ярка ўскрыў шкоду, якая наносіцца нашай прамысловасці дробнабуржуазнай ураўніцельнай, і даў на аснове марксісцка-ленінскай тэорыі аб социялізме праграму барацьбы з ёю. Ураўніцельная ў галіне зарплаты неміну ча вядзе да велізарнай цякучасці на нашых прадпрыемствах. Ва ўмовах новай тэхнікі, калі трэба авалодваць тэхнікай новых вытворчых працэсаў, новых механізмаў і т. д., цякучасць становіцца зусім нецярпімай з'явай. Далей, у аўладанні новай тэхнікі аграмадную ролю адыгрывае рост кваліфікацыі рабочай сілы, тэхнічная вучоба, павышэнне ведаў. Але «ураўніцельная» сістэма заработнай платы, не робячая розніцы паміж кваліфікаванай і некваліфікаванай працай, не толькі не спрыяе павышэнню кваліфікацыі, а, наадварот, гамазе гэту справу. Ураўніцельная зрывае правільную арганізацыю працы на прадпрыемствах. Тав. Сталін у яркай форме растлумачвае антыленінскі характар «ураўніцельных» тэндэнцый:

«Маркс і Ленін гаворыць, што розніца паміж працай кваліфікаванай і працай некваліфікаванай будзе існаваць нават пры социялізме, нават пасля зніштажэння класаў, што толькі пры комунізме павінна знікнуць гэта розніца, што з прычыны гэтага «зарплата» нават пры социялізме павінна выдавацца па працы, а не па патрэбнасці. Але нашы ўраўніцельцы з гаспадарнікаў і профсаюзнікаў не згодны з гэтым і лічаць, што гэта розніца ўжо знікла пры нашым совецкім ладзе. Хто праў—Маркс і Ленін ці ўраўніцельцы? Трэба лічыць, што праўны тут Маркс і Ленін. Але з гэтага вынікае, што хто будуе ніпер тарыфную сістэму на «прынцыпах» ураўніцельскі, без уліку розніцы паміж працай кваліфікаванай і працай некваліфікаванай, той парывае з марксізмам, парывае з ленінізмам» [3]).

Калі тав. Сталін высунуў перад партыяй у сваіх «пасцы ўмовах» задачу ліквідацыі ўраўніцельскі і пар тыя, закасаўшы рукавы, прынялася ажыццяўляць гэту праграму на практыцы, наша прамысловасць і ўся народная гаспадарка дадзі рэзкі скачок у выкананні сваіх планаў. Правільным прымяненнем марксісцка-ленінскага прынцыпу на практыцы мы дабіліся выключна вялікіх поспехаў у аздараўленні гаспадарчага жыцця нашых заводаў і фабрык.

У той-жа час уся зграя ворагаў нашага социялістычнага будаўніцтва ўзняла страшэнны крык. Падоб на таму як пры пераходзе к нэпу нашы ворагі прабавалі паказаць гэты пераход як зварот да капіталізма, так і ў гэтым выпадку не было недахвату ў самых агалцелых і недарэчных выдумках буржуазнага і социял-фашысцкага друку наконт «адмаўлення ад комунізма» і «звароту да капіталістычных метадаў гаспадарання». Трацкісцкі віск займаў у гэтым контрраволюцыйным хоры віднае месца. «Лявацкая» агентура трацкізма, таксама як і правыя апартуністы, з усіх сіл стараліся сарваць барацьбу партыі супроць ураўніцельскі.

У гутарцы з нямецкім журналістам Людвігам, які паўтарыў звычайнае для буржуазных ідэолагаў цвердженне, што «ўсеагульнае ўраўненне з'яўляецца социялістычным ідэалам», т. Сталін наступным чынам растлумачыў сутнасць праблемы:

«Такога социялізма, пры якім усе людзі атрымалі-б адну і тую-ж плату, аднолькавую колькасць мяса, аднолькавую колькасць хлеба, насілі-б адны і тыя-ж касцюмы, атрымлівалі-б адны і тыя-ж прадукты ў адной і той-жа колькасці,—такога социялізма марксізм не ведае. Марксізм гаворыць толькі адно: пакуль канчаткова не зніштожаны класы і пакуль праца не стала з сродка для існавання першай патрэбай жыцця, добраахвотнай працай на грамадства, людзі будуць аплочвацца за сваю работу па працы. «Ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго працы»,—такава марксісцкая формула социялізма, г. зн. формула першай стадыі комунізма, першай стадыі комуністычнага грамадства. Толькі на вышэйшай стадыі комунізма, толькі пры вышэйшай фазе комунізма кожны, пра[illegible] адпаведнасці са сваімі [illegible] больш атрымліваць за сваю працу ў адпаведнасці са сваімі патрэбнасцямі. «Ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па патрэбнасцях».

Зусім ясна, што розныя людзі маюць і будуць мець пры социялізме розныя патрэбнасці. Социялізм ніколі не адмаўляў розніцу ў густах, у колькасці і якасці патрэбнасцяй. Прачытайце, як Маркс крытыкаваў Штырнера за яго тэндэнцыі да ўраўніцельскі, прачытайце марксаву крытыку Гоцкай праграмы 1875 г., прачытайце далейшыя працы Маркса, Энгельса, Леніна і Вы ўбачыце, з якой рэзкасцю яны нападаюць на ўраўніцельку. Ураўніцельку мае сваёй крыніцай сялянскі спосаб мышлення, псіхалогію дзяльбы ўсяго дабра пароўні, псіхалогію прымітыўнага сялянскага «комунізма». Ураўніцельку не мае нічога агульнага з марксісцкім социялізмам. Толькі людзі, не знаёмыя з марксізмам, могуць прадстаўляць сабе справу так прымітыўна, быццам рускія большэвікі хочуць сабраць у адно ўсё дабро і потым падзяліць яго пароўні. Так прадстаўляюць сабе справу людзі, не маючыя нічога агульнага з марксізмам. Так прадстаўлялі сабе комунізм людзі накшталт прымітыўных «комуністаў» часоў Кромвеля і французскай рэволюцыі. Але марксізм і рускія большэвікі не маюць нічога агульнага з падобнымі ўраўніцельскімі «комуністамі» [4]).

К. ЛЕОНІЦЬЕЎ («Большевик»).

(Канец у наступным нумары).

1) Сталін, «Палітсправаздача ЦК XIV з'езду ВКП(б)», стар. 75-76. Парт выдат. 1933.

2) Сталін, «Палітсправаздача ЦК XIV з'езду ВКП(б)», стар. 78. Партвыдат. 1933.

*) Працяг. Пачатак гл. у «Звяздзе» № 68, 69.

3) Сталін. «Пытанні ленінізма», стар. 589-590, 9 выд.

4) Сталін. «Беседа с немецким писателем Эмилем Людвигом». «Большевик», № 8 за 1932 г., стар. 39-4[illegible]

НОВЫЯ АНТЫСОВЕЦКІЯ ФАЛЬШЫЎКІ

БЕРЛІН (БЕЛТА). Блізкая к руху швейцарскіх франтавікоў газета «Бернер таглат» публікуе новыя фальшыўкі, якія «выкрываюць комуністычныя рэвалюцыйныя планы». Гэтыя «дакументы» падпісаны «Маскоўскім цэнтрам комуністычнай партыі».

У іх гаворыцца аб тым, што Швейцарыя, дзякуючы свайму спрыяючаму геаграфічнаму палажэнню, павінна адыграць асаблівую ролю ў сусветнай рэвалюцыі. Своеасаблівасць інтэрнацыянальнага складу насельніцтва гэтай краіны «ўзбуджае імперыялістычныя імкненні яе суседзяў на поўначы і на поўдні, і таму акупацыя Швейцарыі магла-б паскорыць узброеную сутычку паміж Германіяй і астатнімі капіталістычнымі краінамі». Самая-ж акупацыя можа лёгка быць выклікана пры дапамозе рэвалюцыйных выступленняў, якія адначасова з'явіліся-б сігналам для рэвалюцыйнага руху ва ўсёй Еўропе, а Швейцарыя стала-б галоўным цэнтрам пашырэння комуністычных ідэй. Міжнародныя акупацыйныя войскі планамерна павінны быў ці-б быць прыцягнуты на бок рэвалюцыі. Выходзячы з усяго гэтага, ужо цяпер павінна быць узмоцнена і расшырана рэвалюцыйная работа ў Швейцарыі са скарыстаннем усіх спрыяючых умоў.

«Бернер таглат» робіць вывад, што Швейцарыя выбрана стаць «ачагом большэвіцкай змовы ў сярэдняй Еўропе і тым самым мячом у руках вялікіх дзяржаў».

Далей газета паведамляе, што ў «большэвіцкіх дакументах» гаворыцца аб рэвалюцыянізаванні швейцарскай арміі. Мяркуецца нібыта стварыць унутры вайсковых часцей комуністычную арганізацыю для разгортвання шырокай комуністычнай дзейнасці. Для арганізацыі ў швейцарскай арміі сеткі комуністычных ячэек туды будзе паслан германскі комуніст Гекерт, «бо ён, дзякуючы сваёй рабоце ў рэйхсверы, мае вялікі вопыт». Але ён астанецца ў Швейцарыі не больш 3-х тыдняў для таго, каб нацыянал-соцыялісты яго не пазналі. Комуністычныя ячэйкі павінны быць створаны таксама ўнутры афіцэрскага корпуса.

У заключэнне фальшыўка «Бернер таглат» змяшчае «цадрабязнасці аб фінансаванні швейцарскага комунізма». Прэзідыум ВККІ нібыта прызнаў неабходным выдаваць швейцарскай компартыі 2 млн. швейцарскіх франкаў штогод, прычым палавіна гэтай сумы павінна быць скарыстана для работы ў арміі.

* * *

У каментарыях да гэтай тэлеграмы «Известия» пішуць»:

«Швейцарскія фашысты захварэлі маніяй вялікасці ў злучэнні з маніяй праследвання. Не маючы магчымасці выступіць з тэорыяй аб перавагах швейцарскай расы, яны знайшлі другі сродак прыцягнуць да сябе ўвагу. Яны аб'яўляюць Швейцарыю «цэнтрам сусветнага комуністычнага руху». Глупа, але шыкарна. Вядома, афіцэры доблесной швейцарскай арміі аказваюцца ў цэнтры ўвагі комуністаў усяго свету. Фантастычнаму «Маскоўскаму цэнтру комуністычнай партыі» прыпісваецца рассылка такіх-жа фантастычных інструкцый. Але ўсяго гэтага захварэўшым маніяй вялікасці швейцарскім фашыстам мала. Не толькі сусветны комунізм, але і ўсе вялікія дзяржавы толькі і думаюць аб тым, як-бы захваціць Швейцарыю, прычым іх чамусці асабліва спакушае «Інтэрнацыянальны склад насельніцтва Швейцарыі». Бачыце, комуністы і вялікія дзяржавы сумесна «іграюць Швейцарыяй ян мячам». Неабыходзіцца без нязграбнага пераймання ўжо вядомых узораў: іменна з Швейцарыі паследуе «сігнал к сусветнаму ўзрыву».

Сапраўды толькі безнадзейныя палітычныя тупіцы або вар'яты могуць з сур'ёзным тварам выдаваць за праўду падобны ілжывы брэд.

МУЖНАСЦЬ ПАЛІТЗНЯВОЛЕНЫХ У ВЕНЕ

ПРАГА, 28 (БЕЛТА). З Вены паведамляюць аб прадастаўленні новых ільгот арыштаваным лідэрам с.-д. Рэнеру і Зейцу пры адначасовым пагоршанні рэжыму для радавых зняволеных удзельнікаў узброенага паўстання.

У турме венскага краявога суда — каля 3-х тыс. зняволеных. У адзіночных камерах — па 5-6 чалавек. Многія зняволеныя хварэюць. Аднак, турэмная адміністрацыя забараняе перадачу лякарства.

У нядзелю арыштаваных павялі ў турэмную царкву. Зняволеныя сярод службы дэманстратыўна запелі «Інтэрнацыянал». Вечарамі, астаючыся ў сваіх камерах, арыштаваныя падыходзяць да вакон і трохтысячным хорам пяюць «Інтэрнацыянал».

Гэта дэманстрацыя звычайна прыцягвае да прылягаючых к турме вуліц велізарныя масы народу. Ні карцэрам, ні пагоршаннем харчавання, ні пазбаўленнем святла турэмшчыкам не ўдаецца зламаць баявы настрой зняволеных. У турме ў Лісінгу некалькі зняволеных членаў шуцбунда збіты настолькі жорстка, што на ўсё жыццё астануцца калекамі. У канцлагеры Велередорфа сярод удзельнікаў узброенага паўстання прадаўжаюцца масавыя захворванні, выкліканыя жорсткім рэжымам.

ФАШЫСЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ

ЦАРЫЖ, 28 (БЕЛТА). Учора міністэрства юстыцыі апублікавала паведамленне, што пачаліся пошукі тайных складаў зброі.

Газеты паведамляюць, што ў двух асоб, якія гандлююць старым жалезам, выяўлены запасы зброі. У аднаго знойдзены 48 вінтовак і 80 рэвальвераў, у другога 27 рэвальвераў.

Пошукі тайных складаў зброі пачаліся ў сувязі з указаннем урада камісіі па абследванню падзей 6-га лютага на неабходнасць расследваць факты тайнага ўзбраення комуністычных арганізацый.

Фашысцкія газеты, як і трэба было чакаць, выступаюць з вымыслямі, што знойдзеная зброя ні быта належыць комуністам.

«Юманітэ» піша, што паліцыя наўмысна ігнаруе агульнавядомыя факты ўзбраення фашысцкіх арганізацый, пацверджаныя ўзброенымі вулічнымі выступленнямі фашыстаў і паказаннямі мноства сведак. Замест пошукаў зброі ў фашыстаў — заяўляе «Юманітэ» — паліцыя прыступіла к выкананню плана падрыхтоўкі нечуванай правакацыі супроць компартыі і рабочых рэвалюцыйных арганізацый.

СТАНОВІШЧА АРЫШТАВАНЫХ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН У ХАРБІНЕ

БЕЙІІН, 28. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, учора тав. СЛАВУЦКІ наведаў Шы Люй-беня і настойваў на дадатковым расследванні становішча совецкіх арыштаваных, якія трымаюцца ў чыгуначнай паліцыі, на хутчэйшай перадачы іх справы судовым органам і іх вызваленні.

Учора па прапанове чыгуначнай паліцыі совецкі доктар Шырачынскі наведаў арыштаванага нач. станцыі Харбін тав. Ферэнца, які галадае ўжо 5 сутак. Астатнія арыштаваныя галадоўку спынілі. Ферэнец ад спынення галадоўкі адмовіўся, заявіўшы, што ён будзе галадаць 7 сутак у знак пратэсту супроць прадаўжэння яго беспрычыннага арышту.

Сёння ўдзень Сімамура запрасіў тав. Дрыбінскага і заявіў, што заўтра ў СССР высылаюцца 10 арыштаваных: т. т. Шэрпэновіч і Зінкевіч са станцыі Бухеду, т. т. Дэркас і Кліменка — са станцыі Няньцяшань, т. т. Васькоў, Галаваны, Балдзін і два браты Леушавы—са станцыі Чжаланьтунь і т. Здорык — са станцыі Таоланьцжоу. Сімамура ніякіх канкрэтных абвінавачанняў сфармуляваць не змог і абмежаваўся толькі спасылкай на «шкодніцтва». Тав. Дрыбінскі катэгарычна апратэставаў высылку, як неўгрунтаваны і самавольны акт улад. Указаўшы на становішча т. Ферэнца, тав. Дрыбінскі настойваў на хутчэйшым вызваленні яго і астатніх арыштаваных.

ПРЫЕЗД З ХАРБІНА У МАСКВУ ГРУПЫ ВЫЗВАЛЕНЫХ СОВЕЦКІХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

МАСКВА, 28 (БЕЛТА). 27-га сакавіка ў Маскву прыбылі астатнія совецкія чыгуначнікі з ліку 6 арыштаваных манчжурскімі ўладамі адказных агентаў КУЧ. Прыбылі нач. службы цягі КУЧ інжынер КАЛІНА, нач галоўных чыгуначных майстэрань КУЧ інжынер ЛАЎРОЎ і нач. станцыі Пагранічная КАТЫЛЬ. Прыбыўшых сустрэлі на вакзале прадстаўнікі НКШЗ, сваякі і знаёмыя. Прыбыўшыя расказалі аб уражанні, якое зрабіла іх вызваленне на совецкіх чыгуначнікаў КУЧ. Вызваленне з'явілася рэзультатам рашучых настояванняў совецкага урада. Усім прыбыўшым НКШЗ прадставіць водпуск і месца на курортах Совецкага Саюза для лячэння і адпачынку.

ПАХОД МАНЧЖУРСКАЙ ПАЛІЦЫІ СУПРОЦЬ КУЛЬТУРНЫХ УСТАНОЎ КУЧ

ХАБАРАЎСК, 28 (БЕЛТА). Як паведамлялася ўжо, харбінская паліцыя парушыла нармальную работу тэхнікума КУЧ, захваціўшы пад шум прагляду ўсю яго бібліятэку. Гэтым актам пакладзен пачатак паходу манчжурскай паліцыі супроць культурна-асветных устаноў КУЧ—школ, клубаў і бібліятэк.

Цэнтральная бібліятэка КУЧ, у якой сканцэнтравана велізарная колькасць капіталістых навуковых кніг, белетрыстыкі і інш., да гэтага часу закрыта, будучы апечатанай паліцыяй.

Гэтымі днямі кіраўнік КУЧ т. Руды звярнуўся са спецыяльным дакладам у праўленне дарогі, у якім паведаміў, што паводле вестак бібліятэка часта наведваецца белагвардзейскімі чынамі крымінальнага вышуку, і з прычыны таго, што ключы ад яе знаходзяцца ў распараджэнні паліцыі, то захаванасць і становішча каштоўнай навуковай маемасці знаходзіцца пад пагрозай.

Паступаюць весткі аб прадаўжаючыхся наскоках паліцыі на лініі КУЧ на мясцовыя клубы. 24 сакавіка паліцыя патрабавала прадстаўлення пісьмовага дазволу на функцыянаванне клуба на ст. Чжаланьтунь, пагражаючы закрыць клуб. 25 сакавіка апечатана бібліятэка клуба на ст. Яомынь, прычым паліцыяй выклікаліся на допыт і былі затрыманы некалькі совецкіх грамадзян—чыгуначнікаў.

Недапушчальнасць дзеянняў манчжурскай паліцыі ясна з таго, што ўсе культурныя ўстановы КУЧ існуюць на аснове дагавораў з КУЧ, якія забяспечваюць совецкім чыгуначнікам бесперашкодную магчымасць карыстання школамі, клубамі і бібліятэкамі.

Шахматы і шашкі

Пад рэдакцыяй А. А. КАСПЕРСКАГА

Задача № 7

Н. А. Забелін (В.-Усцюг)

Бел.: Крh2, Лс4, Лf1, Сd7, Сd8, Ке6, Кf4 п е4 (8)
Чорн.: Крh4, Фа7, Са4, Сb8 пп:с7, е3, h5 (7)

Мат у 2 хады.

Задача № 8

Р. М. Сімховіч (Ленінград)

З конкурса ВСФКБ—1934 г.

(Друкуюцца ўпершыню).

Бел.: Крa7, Фе8, Лd8, Лf8, Сd5, Сh8, Кd6, Кf6, п с4 (9)
Чорн.: Крe5, Лg7, Лh7, Се2, пп:d4, е4, е7, f4, h6 (9)

Мат у 2 хады.

Канцоўка з партыі з усесаюзнага шашачнага першынства
Бел. МІХЕЛЬСОН—Масква, Чор. І. ГАРДОН—Менск

Белыя прост.: b4, с3, е5, е3, f2, g1, b2 (7)
Чорныя прост.: а5, с7, е7, g5, g7, b4, h5 (7)

Белыя сыгралі е3—f4 і пасля g5:е3, f2:d4, е7—d6, d4—с5; d6:f4, с5—b6; f4—е3! b6:d8; е3—f2! g1:е3; g7—f6, d8:g5; h6:d2 с3:е1; а5:с3 чорныя выйгралі. Аднак-жа замест першага ходу белыя маглі правесці эфектную камбінацыю, знайдзіце яе; прозвішчы знайшоўшых будуць надрукаваны.

АДКАЗНЫ САКРАТАР ШАХМАТНА-ШАШАЧНАЙ СЕКЦЫІ ВЦСПС МАЙСТАР МАЗЕЛЬ—У МЕНСКУ

З удзелам прыехаўшага з Масквы для дапамогі ў разгортванні шахматна-шашачнай работы па БССР шахматнага майстра Мазеля шахсекцыяй ЦСПСБ праводзіцца рад мерапрыемстваў: 25 сакавіка ў Доме Комасветы т. Мазель даў сеанс адначасовай ігры ў шахматы на 27 дамках; рэзультат + 24—3.

Сёння, 30 сакавіка, ў памяшканні рэдакцыі газеты «Рабочай» будзе разыгран невялікі матч з 2-х партый паміж майстрам Мазелем і лепшым гравам Менска тав. Берасавым. Пачатак у 10 гадзін раніцы.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Па Совецкай Беларусі

НОВЫЯ ТРАМВАЙНЫЯ ЛІНІІ

У бягучым годзе на трамвайнае будаўніцтва ў Беларусі адпушчана 2.220 тыс. руб., з іх на Менску 1. 420 тыс. руб.

У Менску будуць пабудаваны новыя трамвайныя лініі працяжнасцю ў 2,72 клм. У план уключана пераноска трамвайнай лініі з Ленінскай вуліцы і злучэнне трамваем Барысаўскага тракта з Старажоўкай і Варашылаўскай вуліцы з Пасажырскім вакзалам.

Пашыраецца трамвайны парк з пракладкай унутрыпаркавых ліній. Для палягшэння абслугоўвання пасажыраў будуць пабудаваны два павільёны. Складаецца праект пабудовы другой трамвайнай падстанцыі на вуліцы К. Маркса, што дасць магчымасць правільна размяркоўваць ток па лініі.

Ужо заключан дагавор на пастаўку 6 новых маторных вагонаў, двух прычэпных і трох грузавых платформ для перавозкі будаўнічых матэрыялаў. Вагоны пачнуць паступаць у другім квартале.

Правядзенне гэтых мерапрыемстваў дасць магчымасць перавезці ў 1934 годзе 38.000.000 пасажыраў супроць 27.500 тыс. пасажыраў у мінулым годзе.

Рэканструіруецца віцебскі трамвай шляхам перабоўкі вузкай калеі на шырокую са злучэннем Маркаўшчыны з вакзалам. Агульная даўжыня ліній 5,3 клм. Будзе пракладзена новая лінія на 3/4 клм. ад вуліцы Вячэўскага да вул. Грамадзянскай, што дасць магчымасць аханіць трамваем новы ўчастак горада.

Для Віцебска заказаны 4 новыя маторныя вагоны.

ФІЗКУЛЬТУРА

* У Віцебску распачата будаўніцтва вялікага спартыўнага стадыёна па праекту вядомага маскоўскага архітэктара Звярынцава. Ужо зроблена планіроўка мясцовасці, закладзен фундамент. Агульны кошт будаўніцтва стадыёна — 2 млн. руб. У гэтым годзе ўступяць у эксплаатацыю спартыўны павільён агульнай кубатурай у 4 тыс. кбм., футбольнае поле з бегавой дарожкай і спартыўныя пляцоўкі.

* Спартыўна - тэхнічная школа ЦСПСБ адкрываецца з 2 красавіка. У школе будуць аддзяленні гімнастычнае, лёгка-атлетычнае і спартыўных гульняў.

* Сёння ў доме фізкультуры адбудуцца спаборніцтвы аборных каманд профсаюза па многабор'і. У спаборніцтвах прымаюць удзел пяць каманд — будаўнікі, металісты, работнікі асветы, гарбары і мукамолы.

ТЭАТР

* У Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета разгледжан макет да оперы «Пікавая дама», зроблены вядомым мастаком маскоўскага тэатра Немірові-Данчэнка тав. Вільямсам. Работа Вільямса атрымала ўхваленне мастацкага кіраўніцтва тэатра і схода мастакоў Менску.

* Пры тэатры оперы і балета ў красавіку арганізуецца балетная студыя на 50 чал. з 7-гадовым курсам навучання. У студыю будуць прымацца дзеці з 10-14-гадовага ўзросту.



Мазырскі пеньказавод, абсталяваны совецкімі машынамі. Магутнасць завода 210 тон пяньки ў месяц.

ІНСТЫТУТ ПЕРАЛІВАННЯ КРЫВІ

Пераліванне крыві, як лячэбны метад, займае ў сучаснай совецкай медыцыне буйнае і зусім заслужанае месца.

Пры радзе захворванняў гэты метад — незамянімы магутны сродак, які дае хуткі эфект там, дзе іншыя лекавыя сродкі аказваюцца бездапаможнымі.

Пры розным роду крывацячэннях — раненні, пасляродавыя, кровастраты ў сувязі з аперацыямі — гемафілія (пераліванне крыві) з'яўляецца важнейшым сродкам, які спрыяе хуткаму спыненню крывацячэння, распаўняе крывастрату і папярэджвае ўпадак сардэчнай дзейнасці.

* * *

Беларускі інстытут пераліванння крыві — маладая навуковая арганізацыя. Ён адкрыт толькі ў пачатку 1933 года, рэарганізаваўшыся з філіяла Маскоўскага інстытута.

Але інстытут ўжо разгарнуў значную арганізацыйную і навукова-даследчую работу і карыстаецца заслужаным аўтарытэтам.

Аб гэтым можам меркаваць хоць-бы з таго, што амаль ва ўсіх гарадах БССР створаны філіялы інстытута, якія праводзяць ужо самастойную практычную работу.

За год зроблена 641 пераліванне.

Пры інстытуце і яго філіялах ёсць шмат донараў — людзей, даючых сваю кроў для мэтаў пераліванння. Вопыт паказвае, што для здаровага чалавека зусім бясшкодна пазбавіцца 400-500 кубікаў крыві нават паўторна. Згубленая кроў аднаўляецца на працягу 1—1,5 месяца.

Інстытут выхаваў кадр гематолагаў-хірургаў. Выпушчан рад навуковых работ. Сярод іх асабліва увагі заслугоўваюць працы праф. Гінзбург, дацэнта Іргера, дактароў Розенталя, Мана і т. д.

Дзейнасць Інстытута ўхвалена Вучоным Саветам Цэнтральнага інстытута пераліванння крыві і гематалогіі ў Маскве.

* * *

Сёння ў менскім Клінічным гарадку адкрываецца ўсебеларуская навуковая канферэнцыя па пераліванні крыві. Будуць прачытаны 36 дакладаў. Чакаецца прыезд выдатных навуковых дзеячаў у гэтай галіне.

М. КІН.

БАЛОТНЫЯ МАСІВЫ—НА СЛУЖБУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ ЗЕМЛЯРОБСТВУ

Белводгас намеціў шырокую праграму масавых работ па асушцы балотных масіваў для ператварэння іх у сельска-гаспадарчыя ўгоддзі соўгасаў і калгасаў. На гэту мэту ў бягучым годзе асігнавана звыш 10 мільёнаў руб.

Асабліва значныя работы запраектаваны ў басейне ракі Арэсы, Любаньскага раёна і ў Рэчыцкім раёне.

Ужо распачата падрыхтоўчая работа. Будуць працаваць 9 экскаватараў. Апошнія поўнасцю адрамантаваны.

Ажыццяўленне меліярацыйных мерапрыемстваў Белводгаса дасць магчымасць ужо ў бягучым годзе асушыць для калгасаў 100 тыс. га балотнай плошчы і для соўгасаў 3.200 га.

УЗНАГАРОДА І. І. БРОДСКАГА

МАСКВА, 28 (БЕЛТА).

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР пастанавіў заслужанага дзеяча мастацтваў Ісака Ізраілевіча Бродскага за выдатныя заслугі ў галіне жывапісі, стварыўшага рад твораў, прысвечаных тэмам пролетарскай рэвалюцыі, сацыялістычнага будаўніцтва і абароны Саюза ССР, узнагародзіў [illegible] Леніна.

ПЕРАСОВАЧНЫЯ МАСТАЦКІЯ ВЫСТАЎКІ

З лепшых экспанатаў усебеларускай мастацкай выстаўкі арганізуюцца перасовачныя выстаўкі для абслугоўвання Віцебска і Гомеля.

Менскаму Дзяржмузею даручана закупіць лепшыя ўзоры жывапісі і скульптуры прадстаўленыя на выстаўцы.

Вядуцца перагаворы з музеем рэвалюцыі аб закупцы некаторых твораў мастакоў.

4-я ўсесаюзная аўта-мота-вела латарэя Аўтадора

АФІЦЫЯЛЬНАЯ ТАБЛІЦА

тыража выйгрышаў па білетах 5-га разрада 4-й усесаюзнай латарэі Аўтадора.

Тыраж адбыўся 25 і 26 сакавіка 1934 г. у г. Менску ў клубе імя СТАЛІНА.

Усяго ў тыражы разыграна 6.801 выйгрыш на суму 234.000 р.

Раней, чым праверыць білеты, звярні ўвагу на разрад білета.

Не змешвай разрадаў. Разрады ўказаны ў правым верхнім рагу білета.

УВАГА: Раней, чым прыступіць да праверкі латарэйных білетаў, неабходна азнаёміцца з правіламі карыстання табл. (гл. ніжэй).

Гэта табліца складзена на картавых запісах нумароў, пачынаючы з ніжэйшых.

№№ серый	№№ латар. білетаў	Кошт выигрышаў у рублях	№№ серый	№№ латар білетаў	Кошт выйгрышаў у рублях	№№ серый	№№ лата. білетаў	Кошт выйгрыш. у рублях	№№ серый	№№ лат. білетаў	Кошт выйгр. у руб.
00121	1—100	40	00129	081	150	05060	033	300	05128	067	300
00137	078	100	00170	033	100	05140	097	300	05182	060	40
00179	1—100	10	00185	1—100	10	05228	1—100	10	05256	012	40
00210	1—100	10	00294	040	300	05262	065	300	05320	069	3000
00309	071	300	00349	074	100	05340	052	150	05421	033	150
00367	1—100	10	00376	009	300	05449	093	150	05482	004	300
00379	1—100	10	00397	055	150	05492	1—100	10	05500	098	300
00401	013	40	00403	009	40	05528	074	150	05554	031	300
00411	1—100	10	00439	061	150	05569	013	150	05580	081	200
00440	1—100	10	00467	096	100	05606	041	300	05612	040	300
00479	093	40	00497	078	40	05620	085	200	05631	044	100
00501	017	300	00520	098	200	05666	1—100	10	05671	048	150
00527	029	40	00695	077	300	05733	051	300	05767	062	100
00757	1—100	10	00869	047	5000	05783	002	300	05796	029	200
00885	065	100	00939	1—100	10	05798	1—100	10	05818	072	150
00941	058	150	00957	015	300	05891	089	300	05934	100	100
00972	024	100	00987	077	300	05953	072	200	05999	1—100	10
00998	093	100	01016	1—100	10	06031	064	40	06059	054	40
01072	036	300	01116	044	300	06076	022	100	06076	053	300
01138	085	500	01148	068	300	06092	026	150	06096	1—100	10
01173	042	5000	01178	040	200	06110	095	300	06150	065	150
01214	080	300	01215	076	150	06171	059	300	06190	1—100	40
01218	036	40	01265	089	100	06207	1—100	10	06258	005	100
01352	036	300	01447	084	300	06303	046	100	06303	060	150
01483	009	500	01521	039	300	06318	016	300	06350	076	150
01528	080	300	01572	086	150	06385	1—100	10	06386	018	200
01632	073	300	01636	086	150	06439	068	40	06533	050	150
01695	032	3000	01774	1—100	10	06537	025	300	06577	024	150
01803	051	300	01825	006	500	06621	088	100	06622	038	300
01865	033	3000	01893	037	100	06660	1—100	10	06726	1—100	10
01977	1—100	10	01982	092	150	06727	071	500	06740	086	200
01999	095	300	02005	1—100	10	06772	083	40	06775	096	150
02009	058	100	02030	1—100	10	06785	071	40	06797	020	40
02053	051	40	02115	064	150	06848	044	150	06873	037	300
02127	035	300	02139	1—100	10	06934	077	300	06948	033	40
02152	027	300	02205	039	100	06982	092	3000	07016	1—100	10
02216	051	300	02321	005	3000	07034	1—100	10	07047	068	300
02350	004	100	02351	1—100	10	07093	090	40	07158	094	100
02390	022	100	02431	054	300	07197	078	100	07208	032	300
02457	100	200	02482	057	150	07223	065	100	07275	053	100
02484	083	40	02513	040	300	07310	1—100	10	07371	078	200
02588	008	100	02599	048	150	07380	033	5000	07390	003	300
02599	022	500	02615	022	300	07426	1—100	10	07440	053	40
02672	080	100	02716	019	3000	07513	021	300	07526	019	300
02744	006	150	02758	004	5000	07543	050	300	07548	073	300
02881	088	40	02902	062	100	07569	071	150	07594	044	300
03048	004	40	03055	009	100	07717	055	150	07735	081	300
03067	036	150	03104	091	3000	07902	041	100	08000	082	150
03166	1—100	10	03208	099	300	08004	005	40	08011	031	150
03210	002	100	03217	037	100	08061	033	500	08085	039	150
03285	046	300	03311	078	300	08184	015	100	08241	006	150
03318	1—100	10	03360	1—100	10	08283	071	3000	08321	001	300
03375	083	300	03421	100	300	08333	008	150	08371	093	300
03445	054	100	03464	1—100	10	08523	014	300	08557	068	200
03531	050	5000	03554	005	40	08558	057	3000	08561	055	100
03626	067	100	03659	073	300	08603	096	300	08626	067	100
03684	064	300	03719	012	100	08643	008	300	08664	089	100
03744	002	100	03749	036	200	08673	1—100	10	08719	074	300
03751	1—100	10	03790	056	300	08742	073	200	08747	047	40
03847	094	500	03900	1—100	10	08757	041	200	08769	056	150
03935	098	300	03974	061	40	08796	030	150	08840	035	300
04010	044	150	04043	046	300	08919	085	300	08947	040	100
04050	053	300	04064	013	3000	08963	046	3000	08978	089	100
04096	1—100	10	04134	012	300	08983	090	150	09009	1—100	40
04141	010	300	04228	088	300	09067	044	100	09073	008	150
04246	061	300	04344	1—100	10	09113	073	300			
04399	032	200	04419	039	150	09146	015	300	09190	074	100
04421	029	300	04428	079	40	09218	070	150	09222	044	40
04428	074	100	04433	008	300	09253	035	300	09263	026	100
04438	090	40	04446	1—100	10	09320	052	40	09333	061	300
04459	085	300	04461	032	100	09408	079	300	09415	066	100
04466	087	40	04521	066	300	09478	061	150	09486	1—100	10
04560	086	150	04570	095	200	09488	042	100	09513	014	500
04593	1—100	10	04622	043	300	09529	078	150	09550	1—100	10
04625	076	150	04671	1—100	10	09555	038	100	09565	049	300
04688	1—100	10	04721	056	150	09584	1—100	10	09647	050	300
04751	010	300	04766	050	40	09656	054	100	09688	055	150
04781	025	150	04794	079	300	09716	034	300	09823	032	300
04855	002	300	04856	024	40	09866	022	300	09874	019	100
04878	036	150	04891	018	300	09876	022	300	09887	023	300
04926	001	200	04982	043	100	09907	020	300	09910	075	300
04998	1—100	10	05010	011	300						

№№ серый	№№ латарэйных білетаў	Кошт выйгрышаў у рублях	№№ серый	№№ латарэйных білетаў	Кошт выйгрышаў у рублях
09948	061	300	10094	002	200
10152	047	200	10237	075	100
10242	075	100	10245	023	300
10271	032	40	10291	017	300
10346	076	300	10351	098	200
10360	1—100	10	10369	047	200
10386	070	300	10421	095	100
10482	1—100	10	10554	078	200
10577	064	150	10598	056	300
10777	023	100	10802	068	500
10838	065	100	10862	059	5000
10904	099	40	10991	013	100
11002	090	150	11011	036	100
11015	078	100	11037	062	150
11051	077	40	11122	077	300
11146	084	300	11181	070	40
11184	096	300	11203	061	200
11221	034	200	11252	057	300
11313	087	40	11357	066	40
11365	1—100	10	11375	1—100	10
11406	013	200	11407	068	40
11423	014	300	11445	033	300
11448	084	150	11476	058	300
11529	051	500	11589	094	150
11627	099	40	11653	046	40
11704	049	100	11720	080	300
11737	074	100	11750	1—100	10
11866	021	100	11887	058	5000
11923	017	300	11944	1—100	40
11958	1—100	10	11999	061	40
12024	055	300	12031	077	100
12121	007	40	12193	038	200
12213	007	300	12230	1—100	10
12258	066	150	12300	070	40
12312	061	100	12314	012	300

№№ серый	№№ латарэйных білетаў	Кошт выйгрышаў у рублях	№№ серый	№№ латарэйных білетаў	Кошт выйгрышаў у рублях
12339	1—100	10	12416	087	300
12454	083	40	12556	001	300
12657	021	300	12768	070	300
12865	072	500	12870	055	300
12878	096	40	12930	011	300
13034	023	100	13038	007	300
13042	014	200	13050	013	40
13057	030	300	13066	050	100
13127	010	150	13173	092	300
13179	063	300	13184	014	500
13186	053	40	13195	031	3000
13230	077	300	13262	054	300
13294	002	100	13294	095	150
13323	074	300	13255	1—100